СОНЦА:
Усход, захад, даўжыня дня:
Мінск — 7.15, 16.32, 9.17;
Віцебск — 7.09, 16.17, 9.08;
Магілёў — 7.04, 16.21, 9.17;
Гомель — 6.53, 16.21, 9.22;
Гродна — 7.31, 16.46, 9.15;
Брэст — 7.25, 16.53, 9.28.
МЕСЯЦ:
Першая квадра 2 лістапада.
ІМЯНІНЫ
Казанскай Божай Маці.

ЗВЯЗДА

4 ЛІСТАПАДА 1992 г.
серада, № 223 (22001)
● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● цана 1 рубель

ВОЗГАДАЕ РОЗГАДАЕ

ФІНАНСАВЫЯ ЦЯЖКАСЦІ РАСТУЦЬ ПРАМА ПРАПАРЦЫЯНАЛЬНА ЦЭНАМ

Ужо 31 кастрычніка жыхароў беларускай сталіцы пачало ў чарговы раз ліхаманіць: падняліся цэны на бензін. Колькі зараз каштуе А-76 ці А-93, мы дакладна сказаць не можам, бо ў Дзяржкамнафтапрадукце 3 лістапада на месцы нікога з адказных асобаў не аказалася. Усе начальнікі і намеснікі начальнікаў, як паведамілі нам у прыёмнай, сабраліся на нараду. Дакладныя лічбы новых цэн на бензін «Звязда» паведаміць у наступным нумары.

Ну а што народ? Народ, які даўно прызвычаіўся да таго, што калі «працэс пайшоў», то, натуральна, яго не спыніць, кінуўся адразу ў магазіны. І, як заўсёды, з паліц сталі знікаць прадукты першай неабходнасці: хлеб, малако, цукар, соль... Размовы ж, якія вяліся ў чэргах, былі напоўнены рознымі песімістычнымі прагнозамі.

— Кажуць, што літар малака будзе каштаваць цяпер рублёў 50.

— Што малако! Вы ведаеце, булка чорнага хлеба будзе каштаваць 28 рублёў!

— Хлеб, малако падаражэе! З пятага кастрычніка цэны падымуцца на ўсё. Трымайся толькі, спадарства!

Так, чуткі прымусілі людзей кінуць усе гаспадарчыя справы, забыцца на выхадныя і зноў... сушыць сухары.

— Што чуткі не маюць пад сабой ніякіх падстаў, я не магу сказаць, — адказаў на пытанне аб чарговым павышэнні цэн на прадукты харчавання і прамысловыя тавары начальнік Дэпартамента цэн Дзяржэканомплана Уладзімір Міхасёў.—Зменены цэн будуць, гэта бясспрэчна. Рэспубліка пачала плаціць за тону нафты 15 тысяч рублёў (нагадаем. што раней тона нафты каштавала 2.816 рублёў), а гэта, як разумееце, выклікае неабходнасць падаражання. Канешне, частку расходаў Беларусь пакрые з бюджэту рэспублікі, але зразумела, што частку прыйдзецца перакінуць і на насельніцтва. Наконт дакладнай даты ўзлёту цэн я нічога сказаць не магу: пакуль варыянты прапрацоўваюцца. Адразу павінен абвергнуць — 5 лістапада цэны не падымуцца: я ўжо ведаў бы пра гэта. Хацелася б, канешне, цэны на хлеб і малако пакінуць без змянення, замарозіць хаця б да новага года. Аднак у Міністэрстве сельскай гаспадаркі кажуць, што цэны на гэтыя прадукты трэба павышаць.

Словам, хто назапасіў танных прадуктаў (ці надоўга іх хопіць — іншая справа), зрабілі гэта своечасова і могуць радавацца. Толькі сумняваюся, што гэты аптымістычны настрой будзе трымацца доўга.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

КОЖНАМУ ПА ТАБУРЭТЦЫ?

Калі б яшчэ год назад на вытворчай нарадзе начальнікам цэхаў Мінскага НВА «Інтэграл» прапанавалі выпускаць... табурэткі, яны выбухнулі б гамерычным смехам. Але зараз ім не да смеху. Не ўся прадукцыя аб'яднання знаходзіць збыт, і выйсце тут адно — вырабляць тое, што можна прадаць. У двух цэхах завода імя Дзяржынскага — механічным і рамонтна-будаўнічым — распачалі выпуск табурэтак. Гэта, можа, і не робіць гонару прадпрыемству высокадакладнай тэхналогіі, але жыццё прымусіла. Табурэтка стала цэхавым клопатам. Рабочыя, майстры, канструктары, тэхнолагі, кіраўніцтва цэхаў занепакоены, як зрабіць табурэтку больш моцнай і прыгожай. Ёсць і надзея, што калі ў кожнага будзе па табурэтцы, дойдзе чарга і да астатніх вырабаў «Інтэграла» — электронных тэрмометраў, тэлефонных апаратаў, блокаў кіравання печамі СВЧ, партатыўных персанальных камп'ютэраў.

Вячаслаў ІШЧАНКА.

СЦВЯРДЖАЦЬ ПРАВА НА РОДНУЮ МОВУ— ТАКСАМА МУЖНАСЦЬ

БЯРОЗА. З 1934 па 1939 год тут існаваў самы жорсткі на тэрыторыі Заходняй Беларусі канцлагер Бярозa-Картузская, праз які прайшло амаль 10 тысяч чалавек — беларусаў, украінцаў, палякаў, непажаданых рэжыму Пілсудскага. Большасць з іх марылі аб светлай будучыні ў складзе СССР, не ведаючы аб тым, што ў Сталіна і ката Пілсудскага вельмі падобныя твары. Але яны былі ўпэўнены, што перш-наперш беларускі народ павінен жыць у еднасці.

— Сёння мы ўспамінаем не камуністаў-змагароў, а беларусаў, — прагучалі ля помніка ахвярам канцлагера словы Генадзя Прановіча, дацэнта Брэсцкага педагагічнага інстытута, — нашых Дзядоў, у якіх хапіла мужнасці сцвярджаць права на родную мову, на сваю зямлю. Не польскі народ павінен у пакутах заходніх беларусаў. Як і Адам Міцкевіч, Пілсудскі быў выхадцам з Беларусі, але потым стаў катам для беларусаў. Якіх розных людзей нарадзіла наша зямля! Але мы павінны дараваць нашу крыўду, каб панавала згода паміж суседнімі народамі.

Мітынг-рэквіем у Бярозе адбыўся па ініцыятыве Таварыства беларускай мовы і Беларускага згуртавання вайскоўцаў. Людзі з Мінска і Брэста прыехалі ўшанаваць памяць загінуўшых, ускласці кветкі да сціплага помніка, нават не прыбранага да свята.

Напэўна, у прадстаўнікоў мясцовай улады ў гэты дзень знайшліся іншыя справы. Напэўна, жыхарам горада чырвоныя сцены былога канцлагера намулялі вочы. Але некалькі чалавек, якія выпадкова апынуліся ў панядзелак ля помніка, нечакана атрымалі добры ўрок памяці.

Ларыса ЦІМОШЫК.

КАЛІ СЛОНІМ БЫЎ МУЗЫЧНАЙ СТАЛІЦАЙ...

ПАЧАЎСЯ 2-ГІ ФЕСТЫВАЛЬ «АДРАДЖЭННЕ БЕЛАРУСКАЙ КАПЭЛЫ»

Аказваецца, напісаць вядомую араторыю «Стварэнне свету» Ёзэфа Гайдна натхніў Міхал Агінскі. Неўзабаве пасля ніхто іншы, як наш зямляк прэм'ер у Будапешце, Пецярбурзе, Лондане, Вене твор быў пастаўлены і ў Слоніме...

Згадаць мноства падобных фактаў з гісторыі музычнай культуры на Беларусі, адкрыць і вярнуць іх слухачу — вось мэта II-га міжнароднага фестывалю «Адраджэнне беларускай капэлы». Ён праходзіць з 1 па 10 лістапада ў дзвюх залах Мінскай філармоніі. Кожны з яго канцэртаў — заяўка на падзею. І за кожным — будзь то адноўленая опера, спецыяльна напісаная да прыезду Кацярыны II у Магілёў, прыдворны радзівілаўскі балет XVIII стагоддзя ці духоўныя песнаспевы таго ж часу — карпатлівыя росшукі і праца музыкантаў - энтузіястаў. Іх каардынатарам, мастацкім кіраўніком адраджэння капэлы стаў вядомы спявак Віктар Скарабагатаў.

Фестываль адкрыўся ўжо згаданай араторыяй Гайдна «Стварэнне свету» ў выкананні дзяржаўнага сімфанічнага аркестра Беларусі і харавой капэлы імя Р. Шырмы. Салiравалі мінскія оперныя спевакі Рыгор Паляшчук, Аляксандр Кеда і пецярбургскае сапрана Эмілія Цітарэнка. За пультам быў таксама пецярбургскі дырыжор Аркадзь Штэйнлухт. Публіка — а ў гэты вечар яна была сапраўды міжнародная — прыняла твор з захапленнем.

Сёння ў філармоніі — опера-знаходка «Уяўная каханка». Выконвае яе пецярбургскі ансамбль «Моцартэум».

Алена ЦІХАНОВІЧ.



БЫЛІ ДЗЯДЫ

І ВУЧЫЦЬ УСІХ, ХТО ЗАСТАЕЦЦА ЖЫЦЬ...

Не шукайце іх імёны ў спісах знакамітасцей. Не за вялікія ўзнагароды ці пасады трапілі гэтыя старыя ў фотааб'ектыў. Мінчане Леў Уладзіміравіч КАВАЛЕНКА і Кацярына Іванаўна ФІЛІПАВА — звычайныя сціплыя пенсіянеры. Дзень памінання продкаў дазволіў убачыць іх лёс па-новаму, каб нам усім, хто жыве ў гэты нялёгкі час, зрабіць для сябе вывад, узяць для сябе прыклад.

З Ільвом Уладзіміравічам я пазнаёміўся ля сцяны былога НКУС. Адсюль у крывавыя гады сталіншчыны для многіх нашых землякоў пачаўся шлях у Курапаты, калымскія лагеры, ссылкі. Прайшоў гэты пакутлівы шлях і Леў Уладзіміравіч. Цудам застаўся ён жыць, і цяпер, на схіле гадоў, самым галоўным для сябе лічыць неабходнасць данесці да людзей праўду пра жахі таталітарызму. Дзеля гэтай праўды сышліся сюды ў дзень памінання былыя вязні. У памяць пра ахвяры паставілі да сцяны каплічку, запалілі свечкі.

Кацярыне Іванаўне праз тыдзень споўніцца дзевяноста гадоў. На могілках, куды яна прыйшла на Дзяды, пахаваныя яе дачка і зяць. Страшэнная сямейная трагедыя абарвала іх жыцці (двума пісталетнымі выстраламі лётчык забіў спачатку сваю каханую прыгажуню-жонку, а потым сябе). Мала хто разумее Кацярыну Іванаўну, калі са сваёй маленькай пенсіі яна купляе два букеты на магілы загінуўшай дачкі і яе забойцы. Напэўна, трэба самому пражыць дзевяноста гадоў, каб зразумець яе пачуццё даравання, каб умець бачыць за асобнымі ўчынкамі нашу агульную існасць.

Яўген ПЯСЕЦКІ.

Паводле новых даных разведкі, фермеры ваююць самі з сабой

С. С. ШУШКЕВІЧ СУСТРЭЎСЯ З ФЕРМЕРАМІ

Мне так спадабаўся выраз — шклянка можа быць напалавіну пустой ці напалавіну поўнай — што я яго адразу прыгадаў, калі пачуў: колькасць фермерскіх гаспадарак павялічылася ў 20 разоў. Тут, праўда, з якога боку глянуць. Калі іх было 100, а стала 2.000, то «ў 20 разоў» здаецца зразумелай, але маленькай такой нацяжкай. Ну, канешне, хочацца болей і болей, масавасці душа прагне, маштабу. Некалі марылі аб пагалоўнай калектывізацыі, цяпер жа ёсць сэнс гаварыць аб фермерызацыі.

У вас склалася ўражанне, што я супраць? Не, крый Божа, «за» і яшчэ раз «за»! Але такая рэч: зямлі ў фермераў 0,34 працэнта. Колькасць калектыўных гаспадарак (а там не адзін і не два работнікі) складае 2.700 — інакш кажучы, нават больш, чым сялянскіх, — аднаасобных, свабодных і незалежных. Так што варта падумаць спакойна і нетаропка.

ПАПЯРЭДНІЯ ЎМОВЫ

Наконт мэтаў сустрэчы было ясна з самага пачатку: хутка Вярхоўны Савет павінен канчаткова прыняць праект «Закона аб уласнасці на зямлю». Той самы, кардынальны і вызначальны, які ніяк не могуць прыняць у прыстойным выглядзе. Ну, памятаеце, як там «сачынілі» калектыўную ўласнасць на зямлю? Між іншым, сам Старшыня аб ёй выказаўся так: «Я не разумею, што гэта такое». Чым вельмі мяне парадаваў: выходзіць, Вярхоўны наш Савет не такі ўжо безнадзейны, калі робіць гэткія «моцныя» адкрыцці.

Дык вось, праект зноў пойдзе ў работу, і пэўныя колы грамадства ажывіліся. Камусьці хочацца так, камусьці — гэтак, але ўсе мараць «паўплываць» на парламент наогул і на яго Старшыню — у прыватнасці, каб прайшоў менавіта іх варыянт. Безумоўна, самы разумны і справядлівы.

Сустрэча з фермерамі С. С. Шушкевіча — з той жа сумнай оперы. Памылкі няма— сумнай. Таму што радавацца няма чаго, таму што — «и вновь продолжается бой»: «вось «чырвоныя», вось «белыя», «будзе бойка», як гаварыў Уладзімір Ільіч. Яна і была.

ПАПЯРЭДНІЯ ВЫНІКІ

Спачатку, як заведзена, далі выказаць усе свае крыўды «таварышам ад сахі». Выказана іх было нават зашмат і самых розных. Прасцей за ўсё іх класіфікаваць так.

1) Крэдытная палітыка дзяржавы. У двух словах: крэдыты атрымаць цяжка, амаль немагчыма, патрабуецца гарант, а знайсці яго — няпроста. Ім могуць быць усе —калгас, райвыканком — і ніхто канкрэтна. Сотні мільёнаў, прызначаных фермерам, да іх не дайшлі. (Тут я цытую Старшыню.)

2) Уласна зямля. У кулуарах вяліся такія гутаркі: «У нас 200 заяў на атрыманне зямлі, а атрымалі толькі 23!», ці «Мы вызначыліся: па 25 гектараў патрабаваць. Далі па 4—5!» Ну, і г. д.

3) Матэрыяльныя рэсурсы. Што яны ў рэспубліцы ёсць— няма сумненняў. Што яны жудасна дарагія — таксама. Што купіць іх фермер не можа — зноў жа так. Апрача новых цэн, я, напрыклад, не даведаўся ні аб чым. Скажам, прыстойны трактар каштуе зараз 600 тысяч — гадавы прыбытак цэлага слабенькага калгаса. Фермер— не калгас, старой тэхнікай не абыдзецца. Па прычыне яе адсутнасці.

Пад усімі трыма пытаннямі я падвёў бы рысу і знізу прыпісаў бы: мясцовая ўлада. Як раней, так і цяпер там усё пачынаецца і заканчваецца. З гэтай нагоды можна разважаць ну проста бясконца. Чаго варты, дапусцім, прыклад фермера з Добрушскага раёна В. Стасенкі, якому 25 сакавіка 1991 года пастанавілі зямлю даць, а 2 красавіка таго ж года — адабраць. Выпадак унікальны. Аднак адзначу, што яшчэ і не самы дзівосны.

За мясцовыя ўлады і ўсе ўлады наогул «на Галгофу» прыйшлося ўзыходзіць Ф. У. Мірачыцкаму і У. Г. Гаркуну. Фёдар Уладзіміравіч, безумоўна, асноўны ўдар прыняў на сябе. Пачаў ён добра, а скончылася ўсё патрабаваннем яго адстаўкі. Канешне, гэта было б проста: прагнеце крыві —вось вам кроў. Але справа ў тым, што праблем гэта не вырашыць.

(Заканчэнне на 3-й стар.).

Пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

АБ ПАРАДКУ ЎВЯДЗЕННЯ Ў ДЗЕЯННЕ ЗАКОНА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ «АБ УНЯСЕННІ ЗМЯНЕННЯЎ І ДАПАЎНЕННЯЎ У ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ «АБ ДЗЯРЖАЎНЫМ БЮДЖЭЦЕ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ НА 1992 ГОД»

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

1. Увесці ў дзеянне Закон Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб Дзяржаўным бюджэце Рэспублікі Беларусь на 1992 год» з дня прыняцця.

2. Даручыць Нацыянальнаму банку Рэспублікі Беларусь выдаць у 1992 годзе Міністэрству сельскай гаспадаркі і харчавання Рэспублікі Беларусь ільготны крэдыт у размеры 20 млрд. рублёў для падтрымання парытэту цэн на сельскагаспадарчую і прамысловую прадукцыю з наступным аднясеннем яе на ўнутраны дзяржаўны доўг Рэспублікі Беларусь.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. ШУШКЕВІЧ.

22 кастрычніка 1992 г.
г. Мінск.

Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь

Аб мерах па забеспячэнню жыллём ваеннаслужачых, звольненых у запас або ў адстаўку

Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

1. Выканкомам мясцовых Саветаў народных дэпутатаў забяспечыць у 1992—1993 гадах выдзяленне ў першачарговым парадку жылой плошчы звольненым у запас або адстаўку асобам афіцэрскага саставу, прапаршчыкам, мічманам і ваеннаслужачым звыштэрміновай службы, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў на 1 ліпеня 1992 г. Будаўніцтва жылля для гэтай катэгорыі грамадзян ажыццяўляецца за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту. У далейшым жылыя памяшканні ўказаным асобам прадастаўляюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, якое вызначае статус ваеннаслужачых.

2. Прасіць Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь:

прыняць рашэнне аб дазволе ў парадку выключэння выканкомам мясцовых Саветаў народных дэпутатаў утрымліваць у 1993—1994 гадах у прадпрыемствах і арганізацый да 8 працэнтаў плошчы ўводзімых у эксплуатацыю жылых дамоў (у тым ліку і за кошт долевага ўдзелу ў жыллёвым будаўніцтве), незалежна ад іх ведамаснай прыналежнасці, для забеспячэння жыллём ваеннаслужачых, звольненых у запас або ў адстаўку;

дазволіць бязвыплатную перадачу ва ўласнасць (з улікам жыллёвай квоты, сумы квот) ваеннаслужачым, звольненым у запас або ў адстаўку, якія

(Заканчэнне на 3-й стар.).

Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь

АБ ДЗЯРЖАЎНЫМ РЭГУЛЯВАННІ ЦЭН НА АСОБНЫЯ ВІДЫ ЭНЕРГАРЭСУРСАЎ

У сувязі са значным павышэннем цэн на нафту, што пастаўляецца ў рэспубліку, і ў мэтах своечасовага забеспячэння народнай гаспадаркі нафтапрадуктамі Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

1. Прыняць да ведама, што пастаўка ў рэспубліку нафтаздабываючымі прадпрыемствамі Расійскай Федэрацыі асобных відаў энергарэсурсаў ажыццяўляецца ў адпаведнасці з двухбаковым міжурадавым пагадненнем па цэнах не ніжэй цэн прамысловасці, якія дзейнічаюць у Расійскай Федэрацыі.

2. Устанавіць, што цана на нафту, якая здабываецца ў рэспубліцы і рэалізуецца на ўнутраным рынку, вызначаецца вытворчым аб'яднаннем «Беларуснафта» па ўзгадненню з Камітэтам па нафце і хіміі пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь з улікам цэн на нафту, пастаўляемую з-за яе межаў.

Міністэрству фінансаў падрыхтаваць прапановы для прадстаўлення ў Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь аб увядзенні дыферэнцыраваных ставак акцызнага збору на нафту, што здабываецца на тэрыторыі рэспублікі, з улікам існуючых горна-геалагічных умоў здабычы і вызначыць парадак яго спагнання і выкарыстання.

3. Цэны на нафтапрадукты і звадкаваны газ, што пастаўляюцца нафта- і газаперапрацоўчымі прадпрыемствамі рэспублікі для рэалізацыі на ўнутраным рынку з улікам падатку на дабаўленую вартасць і акцызу на бензін, вызначаюцца імі па ўзгадненню з рэспубліканскімі органамі нафтапрадуктазабеспячэння і газазабеспячэння. Устанавіць для ўказаных прадпрыемстваў гранічныя ўзроўні рэнтабельнасці па мазуту 5 працэнтаў, па астатніх нафтапрадуктах (уключаючы масла, змазкі і іншыя віды) і звадкаванаму газу—20 працэнтаў да сабекошту.

4. Пастаўку аўтамабільнага бензіну, дызельнага паліва, мазуту прадпрыемствам Міністэрства сельскай гаспадаркі і прадуктаў харчавання, Міністэрства транспарту, Міністэрства энергетыкі, Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі, а таксама насельніцтву, якія з'яўляюцца прыярытэтнымі спажыўцамі, ажыццяўляць па цэнах, прадугледжаных у Дадатку 1.

Камітэту па нафце і хіміі пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь па ўзгадненню з Дзяржэканомпланам вызначыць аб'ёмы ўказанай пастаўкі нафтапрадуктаў да канца 1992 года.

5. Дазволіць нафтаперапрацоўчым прадпрыемствам рэспублікі рэалізацыю на экспарт нафтапрадуктаў, выпрацаваных з дадаткова выкарыстаных імі аб'ёмаў нафты звыш квот, вызначаных урадам Рэспублікі Беларусь, для ліквідацыі запазычанасці нафтагазаздабываючым аб'яднанням Расійскай Федэрацыі, якая ўзнікла ў выніку водпуску цэн на нафту на 29 кастрычніка 1992 г.

6. Прасіць Нацыянальны банк прыняць меры па спрашчэнню аперацый па разліках з нафтаздабываючымі прадпрыемствамі, забяспечыць прыярытэтнае пералічэнне ім фінансавых сродкаў і арганізаваць кантроль за паступленнем ад нафтаперапрацоўчых прадпрыемстваў рэспублікі плацяжоў за нафту.

(Заканчэнне на 3-й стар.).

Лепш за горы можа быць толькі Бацькаўшчына

Для гэтых салдат і афіцэраў яна ператварылася з далёкай і крыху прывіднай у рэальную і блізкую. 325 салдат і сяржантаў і каля 80 афіцэраў і членаў іх сем'яў вярнуліся з Таджыкістана на сваю Радзіму — у Беларусь. Абсалютная большасць з іх пагранічнікі. Таму і кіраваў вывадам нашых ваенных з ахопленай грамадзянскай вайной паўднёвай рэспублікі старшы афіцэр Галоўнага ўпраўлення пагранічных войск РБ палкоўнік Віктар Панцялеенкаў. Якіх намаганняў каштавала яму гэтая аперацыя — ведаюць, мабыць, толькі таджыкскія горы. Ды яшчэ мы, карэспандэнты «Звязды», былі непасрэднымі сведкамі напаўнення рэальным зместам нядаўняй пастановы Савета Міністраў Рэспублікі «Аб пераводзе ваеннаслужачых — грамадзян РБ і ваеннаслужачых, за якімі захоўваецца права на набыццё грамадзянства РБ, з рэспублік Закаўказзя, Сярэдняй Азіі і Прыбалтыкі ва Узброеныя Сілы, унутраныя і пагранічныя войскі РБ».



Апошнім часам мы шмат гаворым пра нацыянальныя інтарэсы, аднак цьмяна ўяўляем, як іх трэба абараняць. Кожны выведзены, вырваны з кіпцюроў чужой нам вайны беларускі пагранічнік — сведка імкнення сапраўды незалежнай дзяржавы думаць і клапаціцца пра сваіх грамадзян.

Упэўнены, што настане час, і Беларусі, як і іншым постсацыялістычным краінам, перастануць ставіць у прыклад Амерыку, якая гатова аб'явіць вайну любой краіне, што закранула годнасць амерыканца. Пакуль мы толькі ўсведамляем беларускае «я» ў кожным сваім пасланцы ў іншыя рэгіёны планеты. Гэтых «я» ў асобе пагранічнікаў майскага прызыву 1991 года засталося толькі ў Таджыкістане 116 чалавек, якія працягваюць абараняць граніцу пад юрысдыкцыяй Расіі.

У нас жа акрамя надзеі, што тыя 116 беларускіх «я», якія знаходзяцца пад пагрозай, дачакаюцца эвакуацыйнага самалёта з Беларусі, фактычна нічога няма. Адпаведныя дамоўленасці паміж урадамі Беларусі, Расіі, Таджыкістана адсутнічаюць. А як патрэбны дзейсныя меры на самым высокім узроўні, каб, сышоўшы з самалётнага трапа дзенебудзь на аэрадроме ў Кобрыне Брэсцкай ці Росі Гродзенскай вобласці, беларускі ваенны мог свабодна ўдыхнуць роднае паветра і сказаць самому сабе: «Прывітанне, Радзіма». І Радзіма магла б са спакойным сумленнем адказаць: «Прывітанне, сын».

Мы былі сведкамі толькі адной аперацыі вяртання беларускіх салдат і афіцэраў на родную зямлю. Але ўсе тыя акалічнасці, якія спадарожнічалі ёй, нам здаецца, уласцівыя ўсім падобным аперацыям. Таму, спадзяёмся, вам будзе цікава больш падрабязна даведацца аб нядаўнім вяртанні на Радзіму з Таджыкістана беларускіх пагранічнікаў, а таксама аб тым, што ўсё ж адбываецца на гэтай паўднёвай зямлі апошнім часам.

Спец. карэспандэнты «Звязды» Аляксандр КОКТЫШ, Сяргей ГРЫЦ (фота).
Мінск — Душанбе—Мінск.

ксераксы CANON FC-2
тэлефаксы PANASONIC KX-50B
SAMSUNG FX-2310
(100 нумароў памяці, таймер)
відэамагнітафоны, відэадвойкі (Japan)
кампютэры IBM PC/AT
партатыўныя кампютэры
NOTEBOOK 386SX-20
Dainova Co,Ltd.
(0172) 217-408, 217-903,
(аўтаінф.) 588-704

ДА КАНЦА ПАДПІСКІ ЗАСТАЛОСЯ 10 ДЗЁН. ІНДЭКС «ЗВЯЗДЫ» — 63850,
ПАДПІСНАЯ ЦАНА НА ПАЎГОДА — 120 РУБЛЁЎ.

У фонды Літаратурнага музея Якуба Коласа паступілі новыя матэрыялы. Сярод іх — партрэты славутага беларускага партызана Васіля Талаша — галоўнага героя аповесці пісьменніка «Дрыгва», а таксама заявы палескага селяніна на імя Чарвякова, аўтабіяграфія, дакументы, якія паведамляюць пра многае. Прыцягваюць увагу фотаздымкі, на якіх дзед Талаш зазняты з партызанамі, партрэты яго сыноў Данілы і Зміцера.

Паступіўшыя матэрыялы дапаўняюць біяграфію партызана, даюць магчымасць даведацца пра ўдзел Васіля Ісакавіча ў Вялікай Айчыннай вайне, яго сустрэчы з Якубам Коласам.

ДА 110-й ГАДАВІНЫ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ Я. КОЛАСА

ДЗЕД ТАЛАШ І ІНШЫЯ

Нашы настаўнікі, літаратары, гісторыкі, ды і землякі партызана — усе, хто пісаў у друку пра героя — дапусцілі ў сваіх матэрыялах скажэнні. Калі вывучаеш напісанае, сустракаешся з фактамі, што не адпавядаюць сапраўднасці, у іх шмат недасказанага, таго, што выклікае сумненне, пераблытанага, малаверагоднага...

Так, пісьменнік Рыгор Няхай у матэрыяле «Стрэльбы, хлопчыкі, бяры!» (часопіс «Полымя» № 5 за 1983 г.) піша:

«У той час каля вёскі Парэчча ў Акцябрскай партызанскай зоне дзейнічаў партызанскі аэрадром. Гэта не так ужо далёка ад Петрыкаўскага раёна. Аднойчы ноччу ў зімовую сцюжу прыходзяць да дзеда партызанскія сувязныя і паведамляюць, што яму трэба неадкладна з'явіцца на аэрадром каля вёскі Парэчча, каб адтуль на самалёце ляцець у Маскву».

І аўтар з гэтай вёскі накіроўвае Васіля Ісакавіча на Вялікую зямлю. Ён не звярнуўся да гістарычных крыніц, не даследаваў, дзе быў і чым займаўся славуты дзед у суровыя гады вайны.

На самай жа справе дзед Талаш быў накіраваны ў Маскву з першага партызанскага аэрадрома, пабудаванага ў канцы 1942 г. на востраве Зыслаў, што на Любаншчыне, дзе партызаніў герой.

І не толькі гэты факт, а і многія іншыя ў матэрыяле не адпавядаюць сапраўднасці: быццам наш герой некалькі гадоў жыў у Маскве, быў на нарадзе ў Мінску, пасля вайны пабудаваў сабе новую хату; пераблытаны час сустрэчы з Якубам Коласам і год смерці Талаша...

Ёсць і іншыя недарэчнасці. Так, газеты «Гомельская праўда» і «Літаратура і мастацтва» пісалі, быццам Якуб Колас тройчы прыязджаў у вёску Навасёлкі на сустрэчу з Васілём Талашом, калі працаваў над аповесцю «Дрыгва». На самай справе такога не было. Васіль Ісакавіч сустрэўся з Якубам Коласам толькі пасля таго, калі выйшла кніга. Талаш уважліва пачытаў яе і выказаў свае меркаванні:

— Я чытаў «Дрыгву» разы тры. І нягледзячы на тое, што імёны некаторых людзей, пра якіх там гаворыцца, зменены, я пазнаю сваіх старых сяброў. Я пазнаю тых байцоў, разам з якімі мы баранілі нашу краіну... Цікавая і праўдзівая кніжка «Дрыгва». Яна не толькі расказвае пра мінулае, але вучыць нас і на будучыню.

Аднак герой кнігі не з усімі фактамі быў згодзен. Многае ён разумеў па-свойму. Паляшук вырашыў сустрэцца з пісьменнікам, каб удакладніць, паспрачацца, дапоўніць. Пра гэту першую сустрэчу Якуб Колас прыгадваў:

— Дзе і калі я сустрэўся з дзедам Талашом? Калі мне не здраджвае памяць, я ўпершыню сустрэўся з героем сваёй аповесці ў Мінску ў будынку Акадэміі навук, калі Акадэмія размяшчалася на Ленінскай вуліцы. Гэта было ў 1934 годзе, пасля таго, калі аповесць была. Дзед Талаш прачытаў яе і вырашыў убачыць мяне. Мы гаварылі з ім пра аповесць. Дзед крыху крытыкаваў мае пралікі. Так, напрыклад, у аповесці дзед названы Рыгорам. На самой жа справе яго завуць Васілём (Ісакавічам). Я пераблытаў і імёны яго сыноў. Ён таксама не быў згодзен са мной і ў тым, што ён збег ад 3-х канваіраваўшых яго польскіх салдат. Дзед упарта стаіць на тым, што іх было 5.

Так успамінаў пісьменнік пра першую сустрэчу са сваім галоўным персанажам. Цікава было ўпершыню пабываць палескаму жыхару ў беларускай сталіцы. Тут яго многае ўразіла: шматпавярховыя дамы, вуліцы, тэатры, асобныя мясціны горада. Ён быў жаданым госцем і ў хаце Якуба Коласа ў Вайсковым завулку, дзе жыў тады пісьменнік.

Прыязджаў Васіль Ісакавіч у Мінск і ў 1939 годзе. У той час кампазітар Анатоль Багатыроў стварыў оперу «У пушчах Палесся», прэм'ера якой адбылася 28 жніўня. У рабоце па яе стварэнню прымаў непасрэдны ўдзел Якуб Колас. Ён нярэдка прысутнічаў на рэпетыцыях, сустракаўся з акцёрамі, расказваў ім аб падзеях грамадзянскай вайны, мужнасці нашага народа. Цёплыя, задушэўныя гутаркі прыносілі карысць, надавалі акцёрам упэўненасць на сцэне.

Былы дырэктар Мінскага тэатра оперы і балета Аскар Гантман успамінае:

— Аднойчы, калі ішла рэпетыцыя партызанскай сцэны, у цёмную глядзельную залу Якуб Колас увайшоў не адзін. Побач з ім быў невысокі, ужо зусім стары, але яшчэ моцны, каржакаваты стары. Пісьменнік клапатліва пасадзіў свайго спадарожніка ў мяккае крэсла.

Загучаў партызанскі хор, заспяваў В. Лапін (выканаўца ролі Андрэя). Калі апошнія гукі партызанскай песні расталі ў далёкіх кутках вялізнай залы, стары спахапіўся, падняўся на сцэну. Падбег да артыста і моцна паціснуў яму руку. Ён, відаць, быў вельмі ўсхваляваны, у яго не па-старэчы светлых вачах пабліскваді слязінкі. Хваляваўся і Лапін...

Колас пазнаёміў нас. Гэта быў легендарны дзед Талаш!

Мастак С. Нікалаеў, які афармляў спектакль, прапаноўваў дзесяткі эскізаў, але адна сцэна не «давалася» яму — у партызанскім лесе. Паказалі малюнкі госцю. «А вось тут—на палянцы, у нас ляжаў вялізны дуб. Не памятаю, ці ссеклі яго, ці маланкай скасіла... Такі волат!» Сам таго не ведаючы, дзед Талаш падказаў мастаку правільнае афармленне сцэны.

Праўда, спачатку стары не мог зразумець адной акалічнасці: аказваецца, сам у жыцці спяваў не так часта, а тут яго будуць паказваць на сцэне, дзе кожнае слова спяваецца! Гутарку з ім адносна опернага жанру павёў рэжысёр спектакля І. Шляпягаў. Дзед Талаш ківаў галавой, хоць на вуснах і хаваў даволі хітраватую ўсмешку.

Водгукі слухачоў і крытыкі пасля прэм'еры сведчылі, што спектакль «У пушчах Палесся» сродкамі опернага мастацтва праўдзіва і ярка адлюстроўвае старонкі нядаўняга мінулага, барацьбу народа супраць інтэрвентаў у гады грамадзянскай вайны. Цяжка сказаць, хто з выканаўцаў быў лепшы — цудоўна спявалі свае партыі многія.

Яны, Якуб Колас і дзед Талаш, надалі радаснай падзеі нараджэння оперы непаўторную прывабнасць. І ім таксама належылі тыя апладысменты, з якімі сустракаўся спектакль і ў Мінску, і ў Маскве ў час Першай дэкады беларускага мастацтва і літаратуры.

Трэці раз Васіль Ісакавіч сустрэўся з Якубам Коласам у суровыя гады вайны ў Маскве ў 1943 годзе. Фотакамера засведчыла гэту памятную сустрэчу: сябры сядзяць за сціплым столікам, перад імі шклянкі чаю з апушчанымі ў іх лыжачкамі, побач сподак з невялікай груткай пячэння. Дзед у самым экстазе гаворкі, ён жвава жэстыкулюе. Якуб Колас хітравата ўсміхаецца. «Я гляджу на яго сялянскі воблік, — пісаў паэт жонцы, — і мне з ім весялей».

Вось тыя сустрэчы пісьменніка з героем, пра якія мала хто ведае. Твор пра дзеда Талаша Якуб Колас напісаў з напісанага і перададзенага яму расказа. Пра гэта ён сам пісаў: «Работа над аповесцю мяне захапіла сама па сабе. Захапіла яна мяне і таму, што я больш-менш добра ведаў Палессе...».

...І нельга падмяняць факты.

Мікола ЖЫГОЦКІ.

Закон Рэспублікі Беларусь

АБ УНЯСЕННІ ЗМЯНЕННЯЎ І ДАПАЎНЕННЯЎ У ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ «АБ ДЗЯРЖАЎНЫМ БЮДЖЭЦЕ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ НА 1992 ГОД»

Паказчыкі Дзяржаўнага бюджэту Рэспублікі Беларусь, зацверджаныя Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь на 1992 год, спрагназіраваны на пачатковы перыяд пераходу да рынкавай эканомікі. Далейшая лібералізацыя цэн на энерганосьбіты і іншыя рэсурсы, якія ўвозяцца і спажываюцца ў рэспубліцы, прымаемыя ў сувязі з гэтым меры па сацыяльнай абароне насельніцтва і падтрыманню парытэту цэн на сельскагаспадарчую і прамысловую прадукцыю, павелічэнне выплат датацый на многія харчовыя тавары і паслугі, іншыя фактары выклікаюць неабходнасць удакладнення на 1992 год рэспубліканскага бюджэту і разліковых паказчыкаў па даходах і расходах мясцовых бюджэтаў абласцей і горада Мінска, пакладзеных у аснову пры вызначэнні нарматываў адлічэнняў у іх бюджэты ад агульнарэспубліканскіх падаткаў і даходаў, а таксама змянення гранічнага ўзроўню дэфіцытаў бюджэтаў.

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе:**

Удакладніць паказчыкі Дзяржаўнага бюджэту Рэспублікі Беларусь на 1992 год і ў сувязі з гэтым унесці наступныя змяненні і дапаўненні ў Закон Рэспублікі Беларусь «Аб Дзяржаўным бюджэце Рэспублікі Беларусь на 1992 год»:

1. Частку першую артыкула 1 выкласці ў новай рэдакцыі:

«Устанавіць, што гранічныя размеры дэфіцытаў бюджэтаў усіх узроўняў Рэспублікі Беларусь на 1992 год не могуць перавышаць 12 працэнтаў ад аб'ёму бюджэту па расходах. Гранічны размер дэфіцыту рэспубліканскага бюджэту вызначаецца без уліку мэтавых паступленняў сродкаў і расходаў, звязаных з ліквідацыяй вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі.

Дазволіць Прэзідыуму Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь павялічваць пры неабходнасці гранічныя размеры дэфіцытаў бюджэтаў Рэспублікі Беларусь у выпадку прыняцця рашэнняў, якія выклікаюць рост расходаў бюджэтаў без адпаведнага павелічэння іх даходаў».

Частку другую лічыць часткай трэцяй.

2. У артыкуле 5 замест слоў «у суме 52882,8 млн .рублёў» запісаць словы «у суме 166368,8 млн. рублёў».

3. Артыкул 6 выкласці ў новай рэдакцыі:

«Артыкул 6. Устанавіць даходы рэспубліканскага бюджэту на 1992 год:

	(млн. рублёў)
Акцызы	16174,1
Падатак на прыбытак (даходы) прадпрыемстваў, аб'яднанняў і арганізацый	33836,4
Падатак на дабаўленую вартасць	63588,3
Падатак на нерухомасць	2024,1
Надзвычайны падатак для ліквідацыі вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС	24000,0
Удзел дзяржаў СНД у фінансаванні расходаў па ліквідацыі вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС	7000,0
Даходы ад знешнеэканамічнай дзейнасці	1800,0
Падатак на паліва	6089,7
Плата за зямлю	611,3
Паступленні свабодных рэшткаў сродкаў бюджэту Пенсіённага фонду Рэспублікі Беларусь	5000,0
Рэшткі бюджэтных сродкаў на пачатак года, якія абарачаюцца на пакрыццё расходаў	504,0
Іншыя падаткі, даходы і непадатковыя паступленні	5740,9

4. Артыкул 7 лічыць страціўшым сілу.

5. У артыкуле 9 замест слоў «у суме 56393,3 млн. рублёў» запісаць словы «у суме 191338,8 млн. рублёў».

6. Артыкул 10 выкласці ў новай рэдакцыі:

«Артыкул 10. Устанавіць у рэспубліканскім бюджэце на 1992 год асігнаванні на:

	(млн. рублёў)
Фінансаванне народнай гаспадаркі	67553,0
у тым ліку на:	
дзяржаўныя капітальныя ўкладанні гаспадарча-разліковых прадпрыемстваў і арганізацый, уключаючы расходы на перапрафіляванне і канверсію вытворчасці	4918,3
дзяржаўную субсідыю сельскагаспадарчым прадпрыемствам і сялянскім (фермерскім) гаспадаркам (на меліярацыю, будаўніцтва ўнутрыгаспадарчых дарог і іншыя расходы па гаспадарчаму добраўпарадкаванню)	4350,6
дзяржаўную датацыю	1237,4
пакрыццё розніц у цэнах	14393,3
аперацыйныя расходы	2841,7
геолагаразведачныя і тапографагеадэзічныя работы	679,9
капітальны рамонт	25,9
будаўніцтва, рамонт і ўтрыманне аўтамабільных дарог, уключаючы ўнутрыгаспадарчыя дарогі (за кошт паступлення сродкаў па падатку на паліва)	6089,7
надбаўкі да закупачных цэн	20900,0
расходы на кампенсацыі падаражання гаруча-змазачных матэрыялаў сельскагаспадарчым прадпрыемствам	2000,0
ільготнае крэдытаванне праграмы «Збожжа	10,0
расходы па вапнаванню кіслых глеб	750,0
ільготнае крэдытаванне канверсуемых прадпрыемстваў	150,0
расходы па закладцы дзяржаўных рэзерваў	5767,0
кампенсацыю жыллёва-будаўнічым кааператывам	
дадатковых затрат і іх ільготнае крэдытаванне	1606,5
іншыя расходы	1832,7
Фінансаванне сацыяльна-культурных устаноў і мерапрыемстваў	25909,1
у тым ліку на:	
народную адукацыю і падрыхтоўку кадраў	12124,8
культуру і сродкі масавай інфармацыі	2914,0
ахову здароўя	5452,1
фізічную культуру	454,7
сацыяльнае забеспячэнне	4963,5
Фінансаванне навукі	4713,9
Утрыманне органаў Міністэрства ўнутраных спраў (уключаючы ўнутраныя войскі)	6658,6
Утрыманне органаў дзяржаўнай бяспекі	941,7
Утрыманне органаў пракуратуры	394,9
Утрыманне судовых органаў	296,0
Расходы на абарону (уключаючы пагранічныя войскі, абароннае спартыўна-тэхнічнае таварыства, штаб і воінскія часці грамадзянскай абароны)	14969,4
Расходы па выпуску нацыянальнай валюты і каштоўных папер	858,0
Расходы, звязаныя са знешнеэканамічнай дзейнасцю	2500,0
Утрыманне органаў дзяржаўнай улады і кіравання	3198,2
Рэзервовы фонд Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь	280,0
Рэзерв Міністра фінансаў	11,8
Рэспубліканскі фонд стабілізацыі эканомікі	296,7
Расходы па абслугоўванню дзяржаўнага ўнутранага доўгу і выдадзеных пазык пад гарантыю бюджэту	7149,8
Іншыя расходы	1537,1
Сродкі для павелічэння абаротнай касавай наяўнасці	125,0
Расходы, звязаныя з падтрыманнем жыццёвага ўзроўню насельніцтва	652,6
Расходы па ліквідацыі вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС	39977,5
Сродкі, якія перадаюцца мясцовым бюджэтам па ўзаемных разліках (уключаючы сродкі для давядзення бюджэтнай забяспечанасці на аднаго жыхара да сярэднерэспубліканскага ўзроўню)	13315,5

7. Артыкул 11 выкласці ў новай рэдакцыі:

«Артыкул 11. Устанавіць на 1992 год сярэднерэспубліканскі нарматыў бюджэтнай забяспечанасці на аднаго жыхара для вызначэння мінімальнага размеру мясцовых бюджэтаў у цэлым па абласцях і гораду Мінску ў суме 14.352 рублі. Для давядзення нарматыву бюджэтнай забяспечанасці да сярэднерэспубліканскага ўзроўню павялічыць асігнаванні па мясцовых бюджэтах на агульную суму 1373,9 млн. рублёў, у тым ліку па мясцовых бюджэтах Брэсцкай вобласці — 723,2 млн рублёў, Віцебскай вобласці — 309,2 млн. рублёў і гораду Мінску — 341,5 млн. рублёў. З улікам гэтага ўстанавіць на 1992 год нарматыў бюджэтнай забяспечанасці на аднаго жыхара ў цэлым па мясцовых бюджэтах Брэсцкай вобласці, Віцебскай вобласці і гораду Мінску ў размеры 14352 рублі, Гомельскай вобласці — 14403 рублі, Гродзенскай вобласці — 14847 рублёў, Мінскай вобласці — 14461 рубель і Магілёўскай вобласці — 14775 рублёў».

8. У артыкуле 13 замест слоў «не больш двух працэнтаў» запісаць словы «не больш пяці працэнтаў».

9. Дапоўніць Закон артыкуламі 20, 21, 22 наступнага зместу:

«Артыкул 20. У сувязі з дадатковай патрэбнасцю ў сродках для сацыяльнай абароны насельніцтва, і ў першую чаргу пенсіянераў і атрымальнікаў дапамог, дазволіць Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь выкарыстоўваць у чацвёртым квартале 1992 года на гэтыя мэты частку свабодных рэшткаў сродкаў бюджэту Пенсіённага фонду Рэспублікі Беларусь у суме 5 млрд. рублёў.

Артыкул 21. Устанавіць на 1992 год расходы рэспубліканскага бюджэту па ліквідацыі вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС у суме 39977,5 млн. рублёў і даходы ў агульнай суме 31000 млн. рублёў (у тым ліку за кошт паступленняў надзвычайнага падатку для ліквідацыі вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС у суме 24000 млн. рублёў і сродкаў удзелу Садружнасці Незалежных Дзяржаў у фінансаванні гэтых расходаў у суме 7000 млн. рублёў) і перавышэнне расходаў над даходамі (дэфіцыт) у суме 8977,5 млн. рублёў.

Нацыянальнаму банку Рэспублікі Беларусь выдаць у бягучым годзе на фінансаванне расходаў па ліквідацыі вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС крэдыт у суме 8977,5 млн. рублёў з далейшым аднясеннем яе на ўнутраны дзяржаўны доўг Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 22. Даручыць Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь удакладніць разліковыя паказчыкі па даходах і расходах мясцовых бюджэтаў абласцей і горада Мінска, пакладзеныя ў аснову пры вызначэнні на 1992 год нарматываў адлічэнняў у гэтыя бюджэты ад агульнарэспубліканскіх падаткаў і даходаў, зацверджаных артыкулам 12 гэтага Закона, і ўнесці адпаведныя змяненні ва ўзаемныя разлікі рэспубліканскага бюджэту з мясцовымі бюджэтамі абласцей і горада Мінска».

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. ШУШКЕВІЧ.

22 кастрычніка 1992 г. г. Мінск.

ДА ЎРУЧЭННЯ ВЯРЫЦЕЛЬНЫХ ГРАМАТ

3-га лістапада Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Каралеўства Даніі ў Рэспубліцы Беларусь Хенрык Рыі Іверсен уручыў вярыцельныя граматы намесніку Старшыні Беларускага парламента Васілю Шаладонаву.

Хенрык Рыі Іверсен нарадзіўся 27 студзеня 1940 года. Мае званне кандыдата юрыдычных навук, кавалер ордэна Данеброга 1-й ступені.

У 1967 годзе ён пачаў працаваць у Міністэрстве замежных спраў Даніі. З 1970 года — сакратар пастаяннага прадстаўніцтва Даніі ў Еўрапейскім Супольніцтве ў Бруселі. З 1974 года — загадчык секцыі Міністэрства замежных спраў Даніі. З 1979 года — эканамічны саветнік дацкай місіі ў ААН (Нью-Йорк). З 1983 года — загадчык аддзела Міністэрства замежных спраў Даніі. З 1986 года — пасол у Каракасе, а таксама акрэдытаваны пасол у Брыджтаўне, Кастрысе, Кінгстаўне, Порт-Оф-Спейн, Порт-О-Прэнс, Санта-Дамінга, Сент-Джорджэс, Разау, Багаце і Кіта. З 1988 года — пасол, начальнік упраўлення па камерцыйных пытаннях Міністэрства замежных спраў Даніі. З 1991 года — адказны сакратар па гандлю Міністэрства замежных спраў Даніі.

Жанаты.

Аддзел інфармацыі МЗС Рэспублікі Беларусь — БЕЛІНФАРМ.

ЭСТЭТЫКА Ў ДАПАМОГУ

Праграма па эстэтычнаму афармленню завода ў 1993 годзе распрацавана на буйнейшым прадпрыемстве рэспублікі — Мінскім трактарным заводзе.

Гэтая справа ў апошні час была занядбана. Практычна спынілася добраўпарадкаванне тэрыторый, што не магло не выклікаць нараканняў завадчан, хоць у іх хапае і іншых праблем. Вырашана ў будучым годзе эстэтыцы вытворчасці надаць агульназаводскае значэнне. Ужо рыхтуюцца праекты добраўпарадкавання цэнтральнай алеі МТЗ і зон адпачынку ў цэхах і на іх тэрыторыях. Наглядная агітацыя, у адрозненне ад іншых гадоў, калі стэнды былі напоўнены заклікамі і лічбамі, цяпер раскажа аб перспектыўных мадэлях трактароў «Беларусь» і сённяшнім жыцці завадчан.

Алег ПРАЦЬКО.

СУМЕЖЖА

Не РБ, а Беларуская Літва?

Маладзёжная патрыятычная арганізацыя «Выбранецкія шыхты» (назва ад слова «выбранцы» — ваенна-служылыя людзі з сялян і шляхты ў Вялікім княстве Літоўскім) прыняла праграмную заяву, у якой, акрамя патрабаванняў лучнасці ўсіх беларускіх этнічных земляў, замацавання права на зямлю і займанне дзяржаўных пасад толькі за карэннымі жыхарамі краіны, першачарговага дзяржаўнага фінансавання нацыянальных культурных і адукацыйных праграм, уведзена прапанова аб змене афіцыяльнай назвы рэспублікі. Замест РБ нашу дзяржаву прапануецца называць Беларускай Літвой: «Вялікае княства Літоўскае — магутная краіна, якая існавала на нашых этнічных землях у XIV—XVIII стагоддзях... Захаванне старажытных духоўных ідэалаў, сінтэз натуральных традыцый — і, як вынік,— росквіт культуры духу, дойлідства, ваярскага майстэрства — галоўныя набыткі сярэднявечнай ліцвінскай дзяржавы». Дзеля пераемнасці гістарычнай, культурнай і нацыянальнай традыцыі, а таксама абапіраючыся на гісторыю развіцця этнасу і дзяржаўных структураў на нашай этнічнай тэрыторыі, выбранцы выступаюць за вяртанне ва ўжытак гістарычнага і дзяржаўнага тэрміна «Літва».

Кіраўнік «Выбранецкіх шыхтоў» Ігар Міхно ў сваім каментарыі праграмнай заявы для «Звязды» падкрэсліў, што вяртаннем назвы «Літва» наш народ не толькі адновіць у памяці сваю мінуўшчыну, але і гарантуе сабе будучыню, якую па праву могуць мець прамыя нашчадкі моцнай і дэмакратычнай дзяржавы— Вялікага княства Літоўскага.

А вось што думае на гэты конт кандыдат гістарычных навук, супрацоўнік Інстытута гісторыі Акадэміі навук Беларусі Генадзь Сагановіч:

— Што датычыць вяртання Беларусі назвы «Літва», якое прапануюць зрабіць «Выбранецкія шыхты», дык я не лічу гэта рэальным. Але хачу сказаць, што ў нашага краю гістарычна было тры назвы, якія маюць аднолькавае права ёй належаць: «Русь», «Літва» і «Белая Русь». Апошняя ў часы сярэднявечча, калі стваралася аснова нашай нацыі, была абсалютна маргінальнай, лакальнай: так называлася правінцыя ВКЛ — усходнія і паўночныя землі нашага краю. Дзяржаўная назва была «Літва». Ёю карысталіся ўсе, хто ведаў ВКЛ: і за яго межамі, і ўнутры краіны. І старабеларускую мову называлі літоўскай, у той жа Маскве, напрыклад, і беларусаў звалі ліцвінамі... Тут ёсць яшчэ адзін момант, звязаны з канфесійнай прыналежнасцю нашых продкаў. Праваслаўныя часцей сябе называлі рускімі, руссю, але зусім не называлі так Масковію. Тут гісторыя шмат наблытала, але калісьці гэтую блытаніну трэба разбіраць.

РАСІЯ

ДРУГАЯ ЕВАНГЕЛІЗАЦЫЯ

Трыццаць гадоў назад вядомы ўжо ў той час амерыканскі прапаведнік Білі Грэм сказаў, што прыйдзе час, калі ён будзе выступаць у Маскве, на стадыёне, сярод дзесяткаў тысяч людзей. 23—25 кастрычніка гэта збылося. Вялізны крыты стадыён «Алімпійскі» быў запоўнены цалкам — не менш дзесяці тысяч людзей стаялі, бо не хапіла месц. Боскія гімны спяваў 7-тысячны зводны хор, падчас першай яго песні нехта выпусціў галубку, якая некалькі разоў абляцела трыбуны... Прыйшло і прыехала сюды на аўтобусах, прыбыло на паяздах шмат вернікаў і зняверваных, шмат дзяцей і старых...

На двух спецыяльных цягніках прыбылі ў Маскву і прадстаўнікі хрысціянскіх абшчын Беларусі, а таксама няверуючыя, якім цэрквамі ЕХБ Мінска, Брэста, Кобрына і іншых гарадоў былі аплочаны білеты ў купэйных вагонах.

Арганізавала ўсё і правяла, выдаткаваўшы сродкі з ахвяраванняў хрысціян Захаду, спецыяльна створаная дзеля правядзення выступленняў Білі Грэма ў Маскве арганізацыя «Адраджэнне-92».

Цяжка сказаць, ці да кожнага з іх дайшлі словы прапаведніка пра Хрыста, пра дабро і любоў, але відавочна, што многія зразумелі: акрамя сённяшніх нявырашаных праблем і пытанняў (хто вінаваты? як зарабіць грошы? як пражыць?) трэба задумвецца і над вечнымі праблемамі—навошта чалавек прыходзіць у свет, чаму ёсць зло, хто ёсць Бог?

Евангелізацыя Расіі, якая цяпер праяўляецца ў імклівым адраджэнні Рускай праваслаўнай царквы, не абмяжоўваецца толькі гэтым. З другога боку Евангелізацыя ідзе праз пратэстанцкія рухі і абшчыны, праз заходнія місіянерскія арганізацыі. Толькі ў Маскве цяпер існуе каля трыццаці залаў, дзе збіраюцца прыхільнікі хрысціянства на заняткі «Першыя ўрокі хрысціяніна», куды запрашаюцца новыя Хрыстовы вернікі. Пасля выступленняў у «Алімпійскім» па многіх краях Расіі паедзе з канцэртамі вядомы хор Глена Дрэйнера з ЗША.

Новае хрысціянскае аблічча Расіі, відавочна, цяпер будзе крыху іншым, чым пасля першай Евангелізацыі.

УКРАІНА

Першая ахвяра ўкраінскіх фашыстаў

Такім кідкім загалоўкам адкрываецца другі спецвыпуск новага міжнароднага тыднёвіка «Европэць» (Львоў). У рэдактарскім артыкуле гаворка ідзе пра асабліва жорсткае забойства ў Цярнопалі дваццацігадовага бадзягі (двойчы судзімага раней). Хоць пракуроры Цярнопаля сцвярджаюць, што забойства адбылося пасля звычайнай п'янкі і яго нельга аднесці да разраду палітычных скандалаў, тым не менш менавіта на палітычным аспекце здарэння настойвае рэдактар тыднёвіка. Справа ў тым, што трое забойцаў — ваякі з Украінскай нацыянальнай самаабароны, ваенізаванай арганізацыі, створанай яшчэ ў дапутчаўскі перыяд. Ваякі гэтыя толькі што вярнуліся з Прыднястроўя...

Цяжка сказаць, наколькі цярнопальскія забойцы з'яўляюцца ўкраінскімі нацыяналістамі і тым больш фашыстамі (паводле сведчання пракуратуры, украінскай мовай яны амаль не валодаюць). Але не ў гэтым справа. Сутнасць у тым, як сцвярджае «Европэць», што на цяперашняй Украіне ствараюцца вельмі прыдатныя ўмовы для арганізацыі розных ваенізаваных фарміраванняў, якія, прыкрываючыся патрыятычнай шырмай, гатовы рабіць чыстку грамадства ад асацыяльных элементаў: бадзяг, прастытутак і г. д. Маладая ўкраінская дэмакратыя заціснута цяпер паміж двума страшнымі полюсамі: чырвоным і карычневым. Таму ні ў якім разе нельга дапусціць стварэння і пашырэння ваенізаваных фарміраванняў — у іх няма патрэбы пры наяўнасці шматтысячнай арміі, што прысягнула на вернасць народу Украіны.

ЛІТВА

Літоўцы ўсіх краёў...

Па ўсім белым свеце, за межамі Літоўскай дзяржавы, жыве каля 1,5 мільёна літоўцаў. Яны аб'яднаны ў Сусветнае таварыства літоўцаў (СТЛ), якое існуе з 1949 года. У апошні час у СТЛ увайшло яшчэ 25 суполак — з Украіны, Латвіі, Эстоніі, Малдовы, Сібіры і іншых краёў.

Літоўская эміграцыя ў многім дапамагла сваёй радзіме абараніць свабоду, адрадзіць дзяржаву, актыўна вялася і эканамічная падтрымка маладой Літоўскай рэспублікі. Але, як адзначыў Старшыня праўлення СТЛ Бронюс Найніс, «кішэня» эміграцыі ўжо ў значнай ступені апарожнена. Калі падлічыць падарункі, то можна сцвярджаць, што ў Літву пайшло ўжо некалькі мільёнаў долараў.

У сваю чаргу літоўскую эміграцыю цікавяць прымаемыя ў Літве законы па праблемах грамадзянства і маёмасці, забраных у яе прадстаўнікоў пасля 1940 года, магчымасць удзелу ў прыватызацыі. Эміграцыя вырашыла звярнуцца да кіраўніцтва Літвы з просьбай прадставіць ёй адзін голас у сейме.

ПОЛЬШЧА

«МАЛАЯ КАНСТЫТУЦЫЯ» ДЛЯ КРАІНЫ

Хоць посткамуністычная Польшча ўступіла ў чацвёрты год свайго існавання, у краіне па-ранейшаму дзейнічае Канстытуцыя ПНР 1952 года. Гэта не толькі абурае людзей, але і тармозіць ажыццяўленне як палітычных, так і эканамічных рэформ. На думку прэзідэнта Леха Валенсы, у першую чаргу трэба было б прыняць т. зв. «малую канстытуцыю», а потым, не спяшаючыся, падрыхтаваць і агульнанацыянальным рэферэндумам зацвердзіць Канстытуцыю Трэцяй Рэчы Паспалітай.

У Сейме была створана Надзвычайная камісія «малой канстытуцыі», кіраваць якой узяўся старшыня Уніі Дэмакратычнай Тадэвуш Мазавецкі. Але ён адразу ж сутыкнуўся з найвялікшай цяжкасцю — адсутнасцю кворуму на пасяджэннях. Члены камісіі зусім не цікавіліся падрыхтоўкай Асноўнага Закона краіны. Нарэшце, пасля доўгіх спрэчак праект «малой канстытуцыі» ў Сейме быў прыняты і перададзены для абмеркавання ў Сенат...

Але сенацкая канстытуцыйная камісія прапанавала адхіліць гэты праект... Незадавальненне і спрэчкі выклікалі пытанні падзелу ўлады паміж прэзідэнтам і парламентам. Прыхільнікі хутчэйшага прыняцця канстытуцыі рэкамендавалі ўсё-такі прыняць праект з сур'ёзнымі папраўкамі. Урэшце з перавагай у адзін голас яго прынялі і вярнулі ў Сейм.

Але цяжка сказаць, ці ўхваліць апошні сенацкія папраўкі і ці згодзіцца з імі прэзідэнт. Лех Валенса можа і не падпісаць канстытуцыю, якая значна абмяжоўвае правы прэзідэнта. Ён патрабуе больш шырокіх паўнамоцтваў для сябе, просіць пакінуць за ім права на незадаволенасць прэм'ерам, права назначаць міністраў. Фарміраваць урад хацеў бы і Сейм. Так што хуткага прыняцця «малой канстытуцыі» не чакаецца.

(ЭЛЬТА).

ЛАТВІЯ

Сто дзён з рублісам

З 20 ліпеня на тэрыторыі Латвійскай Рэспублікі адзіным законным сродкам плацяжу сталі так званыя «рэпшыкі». За час, які прайшоў з таго дня, лепей не стала, але і не пагоршала. Цяпер у абарачэнні 117 млрд. рублісаў. Апасенні, што ўзнікне некіруемая эмісія, не апраўдаліся. Галоўная мэта рэформы ўжо цяпер можа лічыцца дасягнутай — «рэпшыкі» ўспрымаюцца як сапраўдныя грошы, ім давяраюць.

Пазіцыя банка Латвіі адносна безнаяўнай эмісіі катэгарычна адмоўная. Нават урад атрымлівае сродкі «на агульных падставах» — у крэдыт і пад працэнт. Інфляцыя стрымліваецца. Але амаль удвая выраслі працэнтныя стаўкі па крэдытах, скараціліся максімальныя тэрміны крэдытавання...

Выхад Латвіі з рублёвай зоны і ўвядзенне паніжаючых на карысць «рэпшыка» каэфіцыентаў пры разліках з краінамі СНД паставілі эканамічныя адносіны Латвіі з імі на грань краху. Краіне пагражае скарачэнне вытворчасці, рост беспрацоўя і эканамічная самаізаляцыя.

У пачатку кастрычніка ў Латвіі адчувалася нервовасць з-за рэзкага скачка курсу долара ў Расіі (больш як 300 рублёў за 1 долар ЗША). У Латвіі чакалі адпаведнага падзення «рэпшыка» — але гэтага не адбылося. Рубліс стабілізаваўся на адзнацы «180». Суадносіны курсаў долара ў Латвіі і Расіі навязалі і курс абмену расійскіх рублёў на рублісы (цяпер 1 маскоўскі рубель каштуе 0,55 латвійскага).

(«Балтийская газета»).

Выпуск «Сумежжа» падрыхтаваў Валер КАЛІНОЎСКІ. Тэлефон 32-42-93.

ВОЗГАДАЕ ПОЗГАДАЕ

ШЛЯХТА БЕЛАРУСІ САБРАЛАСЯ НА СОЙМ

Устаноўчы Сойм Згуртавання беларускай шляхты адбыўся ў мінскім Доме літаратара.

Шляхетныя нашчадкі Усяслава Полацкага, Давыда Гарадзенскага, Гедыміна ў і Жыгімонтаў, Сапегаў і Скарынаў, Хадкевічаў і Тышкевічаў, Радзівілаў і Глінскіх, Каліноўскіх і Грынявіцкіх заклікаюць нас устаць на абарону незалежнасці Беларусі, яе гісторыі і сучаснасці, яе гаспадаркі, мовы і культуры. Хопіць нам спаць, чакаць косткі з рэшткамі мяса. Беларуская шляхта заклікае ўсіх быць годнымі, самастойнымі ўладарамі свайго лёсу і Бацькаўшчыны.

Наш рух зноў заявіў аб сабе два гады назад, хоць да сапраўднага разумення гісторыі шляхты на Беларусі, яе ролі ў супольным жыцці ўсяго народа яшчэ вельмі далёка. Камусьці вельмі хочацца паказаць беларусаў як народ сялянскі, без сваёй дзяржавы і гісторыі. За апошнія 200 гадоў шмат чаго страчана беззваротна. Але, на шчасце, не ўсё. Узноўлены шляхетны рух на Беларусі гуртуе нашчадкаў старажытных родаў, дапамагае пазнаць свае карані, атрымаць звесткі пра продкаў па мужчынскай лініі (мячы) і жаночай (кудзелі). Беларускую шляхту растрэслі па ўсім свеце, прымушалі змяняць нашыя спрадвечныя прозвішчы і імёны. Сёння мы павінны сабраць сваю спадчыну па крупінках.

Якраз пра гісторыю, сучасны стан і працу беларускай шляхты, пра яе арганізацыю, Статут і Найвышэйшую раду і ішла гаворка на ўстаноўчым Сойме.

Леанід АКАЛОВІЧ.

ІНФАРМАЦЫЯ ДЛЯ РОЗДУМУ:

ПРАДУКЦЫЙНАСЦЬ ПРАЦЫ

У прамысловасці ў Рэспубліцы Беларусь прадукцыйнасць працы склала 319,5 тысячы рублёў на аднаго працуючага. Найбольш высокая яна ў Віцебскай вобласці (364,8 тысячы рублёў), затым ідуць горад Мінск (346,2 тысячы), Гомельская (320,8 тысячы), Магілёўская (315,8 тысячы), Брэсцкая (296,9 тысячы), Гродзенская (289,0 тысячы рублёў). А замыкае «турнірную табліцу» Міншчына, дзе прадукцыйнасць працы з пачатку года склала ўсяго 270,2 тысячы рублёў на чалавека. У параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года па рэспубліцы ў прамысловасці прадукцыйнасць працы складае толькі 88,6 працэнта. Сярод міністэрстваў і ведамстваў найбольшая прадукцыйнасць працы на аднаго працуючага дасягнута ў Мінсельгасхарчы і канцэрне «Беллегпрам» (адпаведна 542,6 і 441,5 тысячы рублёў).

ЗНЯВОЛЕНЫМ — КАЛЯРОВЫ ТЭЛЕВІЗАР

Мінскае навукова - вытворчае аб'яднанне «Цэнтр» наведалі амерыканскія бізнесмены Рональд Нікал і Карл Нільсан з мэтай наладжвання супрацоўніцтва. Апрача таго, яны займаюцца дабрачыннай дзейнасцю. У прыватнасці, Рональд Нікал з'яўляецца прэзідэнтам міжнароднай арганізацыі «Турэмнае брацтва». З гэтай нагоды яны наведалі калонію, што па вуліцы Апанскага, дзе цікавіліся ўмовамі ўтрымання зняволеных.

Як расказаў нашаму карэспандэнту начальнік калоніі палкоўнік Анатоль Барысаў, у цэлым замежныя госці засталіся задаволенымі ўбачаным. Яны гутарылі з асуджанымі, цікавіліся ўмовамі іх жыцця, быту, працы, азнаёміліся з распарадкам дня. Наведалі сталовую для асуджаных, паспрабавалі іх страву. Пабывалі яны і ў бібліятэцы, якая налічвае 14 тысяч кніг, у школе рабочай моладзі, ПТВ, дзе асуджаныя набываюць розныя прафесіі. З цікавасцю даведаліся, што ўсе яны да выхаду з турмы атрымліваюць прафесію, што ў пэўнай ступені дапамагае ўладкавацца на работу, хутчэй прайсці адаптацыю ў вытворчым калектыве. А гэта ў сваю чаргу зніжае рэцыдыўную злачыннасць.

У заключэнне госці падарылі каляровы тэлевізар спецыяльна для пакоя сустрэч асуджаных з блізкімі і роднымі. На ім выгравіравалі на англійскай і рускай мовах: «Гэты тэлевізар ахвяраваны Міжнародным турэмным брацтвам ЗША і фірмай «ПРС» «Лазар Карпарэйшн», ЗША, выхаванцам калоніі і іх сем'ям у імя і на славу Госпада».

Уладзімір ГОЙТАН.

РАДЫЁ «СВАБОДА»

Міністры ўрада Гайдара заяўляюць, што яны гатовыя да З'езду народных дэпутатаў Расіі, нават калі там запатрабуюць адправіць урад у адстаўку. Аднак выказалі меркаванне, што канфлікты паміж выканаўчай і заканадаўчай уладамі могуць сарваць ход рэформаў.

У баснійскім горадзе Яйцэ, які захапілі сербы, працягваюцца баі на вуліцах. У рэгіён прыбылі падмацаванні баснійскіх сіл.

Эксперты ААН пакінулі Ірак, дзе правяралі паведамленні разведвальных службаў аб тым, што Хусейн хавае сотні ракет «Скад». Кіраўнік групы экспертаў заявіў, што ім удалося выявіць шмат прабелаў у інфармацыі аб іракскіх узбраеннях.

Міністр замежных спраў Расіі Козыраў заявіў, што забарона КПСС дапаможа ліквідаваць пагрозу, якая навісла над былымі савецкімі рэспублікамі. Ён таксама адзначыў, што дзейнасць КПСС прывяла да марнатраўства нацыянальных багаццяў краіны. На яго думку, забарона КПСС і падобных арганізацый павінна стаць укладам дэмакратаў у выпрацоўку імунітэту супраць бальшавіцкага віруса.

«ГОЛАС АМЕРЫКІ»

Рост інфляцыі ў Расіі дасягае ўжо пяці працэнтаў за тыдзень. А калі браць у разліку на год, то гэта будзе 1.300 працэнтаў. А бюджэтны дэфіцыт узрастае хутчэй, чым прадпісана Міжнародным валютным фондам. Замежныя саветнікі пры расійскім урадзе папярэджваюць, што калі Цэнтральны банк будзе працягваць субсідзіраваць стратныя прадпрыемствы, то рост інфляцыі дасягне новага ўзроўню.

«Сталіца працуе на аўтапілоце»—гэта загаловак артыкула ў газеце «Вашынгтон пост». У апошнія перад выбарамі дні ў Вашынгтоне не было нікога з вышэйшых кіраўнікоў, яны ўсе ганяліся па краіне за галасамі выбаршчыкаў. Белы дом быў пусты, і ад гэтай пустэчы станавілася неяк жудасна, піша газета. Мала таго, што не было гаспадара Авальнага кабінета, адсутнічалі і вядучыя супрацоўнікі. І толькі некаторыя саветнікі сачылі за сітуацыяй у свеце і краіне і інфармавалі аб гэтым прэзідэнта.

«БІ-БІ-СІ»

Дырэктар Сусветнага банка заявіў, што заходнія краіны даручылі Сусветнаму банку арганізаваць доўгатэрміновую дапамогу былым савецкім рэспублікам.

Намеснік дырэктара Літоўскага тэлебачання Патасінскас заявіў, што Б. Ельцын дзейнічае як цар ці савецкі кіраўнік. Ён таксама заявіў, што былыя камуністы нечакана перамаглі на выбарах і цяпер імперская армія на працяглы тэрмін застанецца ў Літве. Гэтыя меркаванні Патасінскас выказаў у газеце «Лос-Анджэлес таймс».

ПЯЦЬ ДЗЁН У ЛІСТАПАДЗЕ

Па шматлікіх просьбах чытачоў паведамляем, што **неспрыяльнымі ў геафізічных адносінах днямі будуць 8, 11, 17, 27, 29 лістапада.** Тым, хто адчувальны да змяненняў у зямной атмасферы, рэкамендуецца ўважліва сачыць за станам свайго здароўя, выконваць прадпісанні медыкаў, часцей бываць на свежым паветры.

Што датычыць надвор'я ў апошнім восеньскім месяцы, то ніякіх значных адхіленняў ад шматгадовых назіранняў не прадбачыцца: тэмпература паветра будзе на 1 градус вышэй звычайнага, ападкаў чакаецца 40—70 мм — гэта норма.

Паводле новых даных разведкі, фермеры ваююць самі з сабой

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Між іншым, прамову міністра я слухаў з адкрытым ротам. Мяркуйце самі: Мірачыцкі лічыць, што калектыўная ўласнасць — гэта тупік, што даваць трэба па 50 гектараў зямлі, астатняе — у арэнду, зямлю перадаваць за плату. Калі б сам не чуў, не паверыў бы. А ўвогуле, міністру закон не прымаць, можна і пагаварыць. Прымаць закон будзе У. Г. Гаркун, а вось ён рэвалюцыйнасцю поглядаў сход не ўразіў.

Зноў радуюся паслядоўнасці і цвёрдасці поглядаў Уладзіміра Гіляравіча. Вось ён прыйшоў да высновы, што да прыватнай уласнасці на зямлю мы даспелі. Тым не менш, яснага адказу накшталт: «Я за прыватную ўласнасць» ад яго ніхто не пачуў. Як быццам і не супраць, як быццам і не за. А вось за штó старшыня камісіі ВС, дык гэта за рэферэндум па пытанню прыватнай уласнасці. Дарэчы, С. С. Шушкевіч растлумачыў прысутным яго сутнасць: калгаснікаў старанна «апрацуюць», і яны прагаласуюць за тое, што скажа старшыня. А што ён скажа, можна здагадацца.

Так што вось вам спектр поглядаў тых, ад каго будзе залежаць прыняцце закона. Нічога, словам, няясна, апрача таго, што ёсць розныя групоўкі. Якая пераможа — невядома. Праўда, магчымае ўмяшанне трэцяй сілы. Ніхто не гарантуе, што ў вызначаны час плошчу Незалежнасці не запоўняць фермерскія трактары... Такога мы за апошнія гады таксама нагледзеліся.

ШТО СКАЗАЎ ПРА ЎСЁ ГЭТА С. С. ШУШКЕВІЧ

— Вы стварылі сабе востраў, — Старшыня Вярхоўнага Савета палічыў неабходным адразу расставіць кропкі над «і», — і паціху забываеце аб грамадскіх праблемах.

Напэўна, гэта сапраўды так. Мне, праўда, уяўляецца некалькі інакш: ім, фермерам, стварылі гэты востраў і ціхенька туды перасялілі.

Таксама справядліва. З другога боку, манцёр Мечнікаў з «Дванаццаці крэслаў» бачыў праблему так: «Згода ёсць прадукт пры поўным непраціўленні бакоў». Інакш кажучы, за што фермеру паважаць уладу, калі яна не паважае яго? Змірыцца і чакаць лепшых часоў і справядлівай улады? А колькі чакаць?

Я гаварыў з многімі фермерамі, «рэвалюцыянераў» сярод іх не многа. Так, згаджаюцца яны, зямельная рэформа—штука складаная, за год не зробіш. Пры гэтым заўважалі: але яе трэба рабіць, а не гаварыць розныя прыгожыя словы.

Наогул, цяжка не зразумець С. С. Шушкевіча. У фермера кавалак зямлі, у яго— уся рэспубліка. І дзірак у ёй хапае. Толькі трэба зразумець і яму: як ён сам справядліва адзначыў, фермераў яшчэ вельмі мала. Дык, напэўна, дапамагчы ім лягчэй якраз па гэтай прычыне, ці я памыляюся?

Мне ніяк не хочацца выглядаць лабістам, але сам жа Старшыня гаворыць: робяцца спробы тарпедаваць стварэнне таварных гаспадарак. Хто гэта? Якім чынам? Дзе той злодзей? Пакуль, як сумна канстатаваў мой сусед злева, «абапірацца трэба на свае вілы». І, між іншым, меў рацыю.

На гэтым крытыку скончу і выкладу тое, што гаварыў Старшыня ВС, проста тэзісна.

Мясцовая ўлада недасканалая, але і ў Вярхоўным Савеце мы не прыйдзем да высновы, якой яна павінна быць. (Можа, таму што і сам Вярхоўны Савет недасканалы?)

У Галандыі ёсць фермеры, ёсць рынак, а прыватнай уласнасці на зямлю няма. (Гаворым пра свой асабісты шлях, а колькі Галандый размесціцца на тэрыторыі Беларусі?).

Я не перакананы, што ВС пагодзіцца з пераглядам «Закона аб уласнасці на зямлю». (Думаю, каменціраваць і не трэба.)

Крэдыты трэба недзе браць. Адкуль? Нешта не дадзім дзецям, пенсіянерам, праядзім не намі зароблене. Такая палітыка — развал дзяржавы. (Наўмысная ці не затрымка зямельнай рэформы —таксама развал дзяржавы. У хуткім будучым.)

Але падвядзём рысу. Усё той жа сусед злева зрабіў гэта так: «Эх! Дарэмна бензін спаліў...» Выдатна яго разумею: ехаў за канкрэтным рашэннем канкрэтных праблем — атрымаўся партыйна-калгасны сход, дзе кожны крычаў аб сваім. І ніхто нікога не чуў.

А па-іншаму быць і не магло. Ні з крэдытамі, ні з цэглай, ні з зямлёй нічога не вырашыцца, пакуль не вырашыцца з уладай.

Так што абапірацца трэба сапраўды толькі на свае вілы. Фермер паспяхова працягвае ваяваць сам з сабою.

Сяргей ШАЎЦОЎ.

Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь

АБ ДЗЯРЖАЎНЫМ РЭГУЛЯВАННІ ЦЭН НА АСОБНЫЯ ВІДЫ ЭНЕРГАРЭСУРСАЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

7. Рэалізацыя нафтапрадуктаў на ўнутраным рынку праз арганізацыі нафтапрадуктазабеспячэння ажыццяўляецца па цэнах прамысловасці на іх (на ўмовах франка-станцыя), вызначаемых гэтымі арганізацыямі зыходзячы з цэн прадпрыемстваў, падатку на паліва і забеспячэнска-збытавых надбавак згодна з Дадаткам 2. У забеспячэнска-збытавой надбаўцы ўлічваюцца камісійны збор за пасрэдніцкія паслугі, іншыя расходы пасрэднікаў, а таксама падатак на дабаўленую вартасць.

Нафтапрадуктазабяспечв а ючым арганізацыям, якія закупляюць за межамі рэспублікі нафтапрадукты па цэнах, што адрозніваюцца ад цэн унутранага рынку, рэалізоўваць іх да канца 1992 года спажыўцам па цэнах набыцця з указанымі надбаўкамі.

8. Рэалізацыя на ўнутраным рынку ўсім спажыўцам (уключаючы насельніцтва) нафтапрадуктаў, акрамя газы і пячнога паліва, ажыццяўляецца аўтазаправачнымі станцыямі, гандлёвымі, іншымі прадпрыемствамі і арганізацыямі па цэнах прамысловасці на іх з гандлёвай надбаўкай у памеры не больш чым 2 працэнты. У гандлёвай надбаўцы ўлічваюцца выдаткі абарачэння, іншыя расходы прадаўца, а таксама падатак на дабаўленую вартасць.

9. Газазбытавыя арганізацыі рэалізуюць звадкаваны газ спажыўцам (акрамя насельніцтва) па цэнах, якія ўстанаўліваюцца выходзячы з цаны яго набыцця, затрат, звязаных з рэалізацыяй, і гранічнага ўзроўню рэнтабельнасці ў памеры 30 працэнтаў да гэтых затрат.

10. Даходы, атрыманыя ад перавышэння гранічных узроўняў рэнтабельнасці, уносяцца нафтаперапрацоўчымі прадпрыемствамі і газазбытавымі арганізацыямі ў дзяржаўны бюджэт з прыбытку, які застаецца ў іх распараджэнні, у адпаведнасці з парадкам, вызначаным Міністэрствам фінансаў.

11. Устанавіць, што новыя цэны на нафту, нафтапрадукты і звадкаваны газ уводзяцца з моманту іх узгаднення з рэспубліканскімі органамі нафтапрадуктазабеспячэння і газазабеспячэння.

12. Зацвердзіць гранічныя каэфіцыенты павышэння цэн і тарыфаў на асобныя віды спажывецкіх тавараў, рэалізуемых насельніцтву, згодна з Дадаткам 3.

13. Дзяржэканомплану сумесна з Міністэрствам фінансаў, іншымі зацікаўленымі міністэрствамі і ведамствамі ўнесці ў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь прапановы аб змяненні рознічных цэн і тарыфаў на прадукцыю і паслугі для насельніцтва, якія падлягаюць дзяржаўнаму рэгуляванню, у сувязі са змяненнем цэн на энергарэсурсы.

14. Аблвыканкомам і Мінскаму гарвыканкому праводзіць карэкціроўку тарыфаў на электрычную і цеплавую энергію для ўсіх спажыўцоў (акрамя насельніцтва і сельскагаспадарчых спажыўцоў) з улікам цэн на энергарэсурсы.

15. Міністэрству фінансаў у месячны тэрмін унесці ў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь прапановы аб датацыі на газ, цвёрдае паліва, камунальныя паслугі, паслугі гарадскога пасажырскага транспарту, што прадастаўляюцца насельніцтву, на вытворчасць мяса - малочнай прадукцыі, а, таксама на фінансавую падтрымку асобным катэгорыям інвалідаў пры рэалізацыі ім аўтамабільнага бензіну і звадкаванага газу.

16. У мэтах забеспячэння эканоміі энергарэсурсаў і структурнай перабудовы энергаёмістых вытворчасцей Дзяржэканомплану сумесна з Міністэрствам энергетыкі, Дзяржаўным камітэтам па прамысловасці і міжгаліновых вытворчасцях і з удзелам зацікаўленых распрацаваць і прадставіць ураду рэспублікі прапановы аб энергазбяражэнні ў галінах народнай гаспадаркі.

17. Камітэту па нафце і хіміі пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь сумесна з Камітэтам па кіраванню дзяржаўнай маёмасцю пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь паскорыць вырашэнне пытанняў, звязаных са стварэннем сумесных прадпрыемстваў з нафтагазаздабываючымі аб'яднаннямі Цюменскай вобласці.

18. Дзяржаўнаму мытнаму камітэту, Дзяржаўнаму камітэту па знешніх эканамічных сувязях, Дэпартаменту эканамічнага кантролю пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь узмацніць кантроль за вывазам нафтапрадуктаў за межы рэспублікі.

Ліцэнзіі на вываз нафтапрадуктаў у краіны, былыя суб'екты СССР, якія не ўваходзяць у СНД, выдаюцца Дзяржаўным камітэтам па знешніх эканамічных сувязях па ўзгадненню з Дзяржэканомпланам і Камітэтам па нафце і хіміі пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь.

19. Лічыць страціўшымі сілу: пункты 1 і 2 пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 17 чэрвеня 1992 г. № 370 «Аб дзяржаўным рэгуляванні цэн на асобныя віды энергарэсурсаў» (ЗП Рэспублікі Беларусь, 1992 г. № 18, ст. 324) у частцы цэн на нафту і нафтапрадукты;

распараджэнне Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 9 кастрычніка 1992 г. № 1016р.

Старшыня Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь В. КЕБІЧ.
Намеснік кіраўніка спраў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь В. ДЗЕБЛІКАЎ.

30 кастрычніка 1992 г.
г. Мінск.

ДАДАТАК 1

Пералік асобных відаў нафтапрадуктаў, на якія ўстанаўліваюцца гранічныя ўзроўні павышэння цэн

Гранічны каэфіцыент павышэння цэн

Аўтамабільны бензін, дызельнае паліва, мазут 5*

*) Да цэн прэйскуранта № 04-02-03, 1992 г.

Намеснік кіраўніка спраў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь В. ДЗЕБЛІКАЎ.

ДАДАТАК 2

Забеспячэнска-збытавыя надбаўкі да цэн на нафтапрадукты

Цана прадпрыемства (вытворцы-пастаўшчыка) на нафтапрадукты з улікам падатку на дабаўленую вартасць (рублёў за тону)	Забеспячэнска - збытавая надбаўка ў працэнтах да цаны прадпрыемства (вытворцы-пастаўшчыка)
да 10.000	12
ад 10.000 да 15.000	8
ад 15.000 да 20.000	6
ад 20.000 да 25.000	5
ад 25.000 і вышэй	4

Заўвага. Размер забеспячэнска-збытавой надбаўкі для асобных прадпрыемстваў можа змяняцца ва ўстаноўленым парадку або па рашэнню Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Намеснік кіраўніка спраў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь В. ДЗЕБЛІКАЎ.

ДАДАТАК 3

Пералік асобных відаў рэалізуемых насельніцтву спажывецкіх тавараў, на якія ўстанаўліваюцца гранічныя ўзроўні павышэння цэн і тарыфаў

	Гранічныя каэфіцыенты да ранейшых устаноўленых дзяржаўных рэгулюемых цэн (з улікам падатку на дабаўленую вартасць)
Асвятляльная газа, пячное бытавое паліва	2,0*
Звадкаваны газ для бытавых патрэб насельніцтва	4,2**

* Да цэн на асвятляльную газу і пячное бытавое паліва, устаноўленых прэйскурантам № 04-02-03, 1992 г., II раздзел.

Гандлёвыя скідкі на асвятляльную газу і пячное бытавое паліва прымяняюцца згодна з прэйскурантам № 04-02-03, зацверджаным пастановай Дэпартамента цэн пры Дзяржэканомплане ад 16 чэрвеня 1992 г. № 133Ц.

** Да цэн і тарыфаў па стану на 15 красавіка 1992 г., устаноўленых прэйскурантам № 130-03, раздзелы II і III.

Намеснік кіраўніка спраў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь В. ДЗЕБЛІКАЎ.

* * *

Прыняцце ўказанай пастановы выклікана тым, што з 18 верасня 1992 года, выконваючы ўказ Прэзідэнта Расіі, нафтаздабываючыя прадпрыемствы значна павысілі адпускныя цэны на нафту. У залежнасці ад рэгіёна здабычы цэны на пастаўляемую Беларусі нафту вагаюцца ад 10 да 24 тысяч рублёў за тону.

Такое становішча магло б прывесці да непрадказальных вынікаў у эканоміцы рэспублікі.

Ва ўзнікшай сітуацыі ўрад палічыў неабходным захаваць эканамічныя рычагі ўздзеяння на вытворчасць і рынак шляхам рэгулявання цэн на нафтапрадукты.

Рэгуляванне цэн прадугледжвае жорсткія абмежаванні гранічных нарматываў рэнтабельнасці пры вытворчасці нафтапрадуктаў і водпуск іх прыярытэтным спажыўцам па фіксаваных цэнах.

Такім чынам, цана 1 літра бензіну А-76 павысілася з 6 рублёў да 30 рублёў, А1-93 з 7 рублёў да 35 і г. д.

Што датычыць іншых спажыўцоў, то рэалізацыя нафтапрадуктаў будзе ажыццяўляцца па свабодных (дагаворных) цэнах у залежнасці ад цаны і тоны нафты, закупленай у Расіі, затрат па перапрацоўцы, прыбытку і адпаведных налічэнняў.

Гэтай жа пастановай прадугледжана павышэнне рознічных цэн на звадкаваны газ толькі ў 4,2 раза ў параўнанні з дзеючымі па стану на 15 красавіка 1992 г., паколькі асноўным яго спажыўцом з'яўляецца сельскае насельніцтва.

Але нават і пры такім павышэнні рэалізацыя звадкаванага газу насельніцтву застаецца стратнай і датуецца дзяржавай з бюджэту.

Так, страты ад рэалізацыі яго ў разліку на год складуць 5,5 млрд. рублёў. Адмяніць поўнасцю асігнаванні з бюджэту на гэтыя мэты нельга, паколькі ў адваротным выпадку кошт аднаго балона з газам павялічыцца ў 11,5 раза і жыхар рэспублікі вымушаны будзе плаціць дадаткова 1.000 рублёў у год.

У сувязі з гэтым урад захаваў датацыю, выдзяляемую з бюджэту. Кошт аднаго 50-літровага балона з газам складзе 132 рублі.

Цэны на пячное паліва і газу асвятляльную на сённяшні дзень засталіся без змянення, г. зн. на ўзроўні, прынятым па стану на 9 кастрычніка г. г.:

паліва пячное — 8 руб. 40 кап. і 9 руб. за 10 літраў;

газа асвятляльная — 4 руб. за 2 літры.

Намеснік дырэктара Дэпартамента цэн пры Дзяржэканомплане А. ПАКРАМОВІЧ.

Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь

АБ МЕРАХ ПА ЗАБЕСПЯЧЭННЮ ЖЫЛЛЁМ ВАЕННАСЛУЖАЧЫХ, ЗВОЛЬНЕНЫХ У ЗАПАС АБО Ў АДСТАЎКУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

бездакорна праслужылі на ваенай службе не менш як 20 каляндарных гадоў, займаемых імі жылых памяшканняў.

3. Устанавіць, што пры будаўніцтве індывідуальных жылых дамоў і кватэр у дамах жыллёва-будаўнічых кааператываў ваеннаслужачымі (у тым ліку звольненымі ў запас або ў адстаўку), акрамя ваеннаслужачых, якія праходзяць тэрміновую службу па прызыву, частка яго кошту фінансуецца за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту. Будаўніцтва такіх дамоў (кватэр) ажыццяўляецца на ўмовах, прадугледжаных пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 27 сакавіка 1992 г. № 165 «Аб першачарговых мерах па развіццю індывідуальнага і кааператыўнага жыллёвага будаўніцтва ва ўмовах пераходу да рыначнай эканомікі» (ЗП Рэспублікі Беларусь, 1992 г., № 9, арт. 150).

Размер сродкаў рэспубліканскага бюджэту, што накіроўваюцца на ўказаныя мэты, складае 50 працэнтаў каштарыснай вартасці будаўніцтва жылля стандартнага ўзроўню, пры якім кошт аднаго квадратнага метра агульнай плошчы вызначаецца выходзячы з сярэдняга кошту, што складваецца па рэспубліцы пры будаўніцтве за кошт дзяржаўных сродкаў, а норма забяспечанасці роўная 18 кв. метрам агульнай плошчы на аднаго члена сям'і.

Указаная датацыя прадастаўляецца ваеннаслужачым выканкомамі мясцовых Саветаў народных дэпутатаў ў парадку, што вызначаецца Міністэрствам фінансаў.

4. Мінскаму аблвыканкому і Мінскаму гарвыканкому да 15 лістапада 1992 г. ва ўстаноўленым парадку вырашыць пытанне аб выдзяленні ваеннаслужачым, звольненым у запас або ў адстаўку, зямельных участкаў для будаўніцтва 1000 індывідуальных жылых дамоў.

5. Прыняць прапанову Міністэрства абароны аб аднясенні жылой плошчы ў дамах, што знаходзяцца ў закрытых і адасобленых ваенных гарадках, да ліку службовай.

Ваеннаслужачыя, звольненыя са службы па ўласнаму жаданню без уважлівых прычын, за парушэнне дысцыпліны або за ўчыненне злачынства, падлягаюць высяленню са службовых жылых памяшканняў з усімі асобамі, якія пражываюць з імі, без прадастаўлення іншых жылых памяшканняў.

6. Распаўсюдзіць дзеянне гэтай пастановы на асоб афіцэрскага саставу, прапаршчыкаў, мічманаў і ваеннаслужачых звыштэрміновай службы Міністэрства ўнутраных спраў, Камітэта дзяржаўнай бяспекі і галоўнага ўпраўлення пагранічных войск пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Старшыня Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь В. КЕБІЧ.
Кіраўнік спраў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь М. КАЎКО.

26 кастрычніка 1992 г. г. Мінск.

Міхась ТКАЧОЎ

31 кастрычніка 1992 года пасля цяжкай хваробы памёр выдатны беларускі вучоны, грамадскі і палітычны дзеяч Міхась Аляксандравіч **Ткачоў.** Памёр адданы патрыёт Беларусі, даследчык яе гісторыі, чалавек, які стаяў у першых шэрагах змагароў за аднаўленне незалежнасці нашай дзяржавы.

Міхась Ткачоў нарадзіўся 10 сакавіка 1942 года ў г. Мсціславе Магілёўскай вобласці ў сям'і настаўнікаў. У 1959 годзе паступіў на гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Ужо тут выявіліся здольнасці М. Ткачова да даследчыцкай працы. Скончыўшы ўніверсітэт, настаўнічаў у Жодзіне. З 1968 года — супрацоўнік Інстытута гісторыі Акадэміі навук Беларусі. З 1978 года — выкладчык Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта, дзе ў 1983—1985 гг. загадваў кафедрай. У 1989 годзе М. Ткачоў быў па конкурсе абраны загадчыкам рэдакцыі гісторыі Беларусі ў выдавецтве «Беларуская Энцыклапедыя» імя Петруся Броўкі. 6 красавіка 1992 года ён прызначаны галоўным рэдактарам Беларускай Энцыклапедыі.

М. Ткачоў абараніў у 1987 годзе доктарскую дысертацыю. У 1989 годзе яму прысвоена званне прафесара. Яго пяру належаць больш як 400 навуковых публікацый. Ім напісаны кнігі «Замкі Беларусі» (выдавалася двойчы), «Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі 13—18 стст.», «Замкі і людзі». Ён адзін з аўтараў прац «Нарысы па археалогіі Беларусі», «Асвета і педагагічная думка ў Беларусі», «Гісторыя беларускага мастацтва», «Беларуская кафля», браў удзел у стварэнні «Збору помнікаў гісторыі і культуры Беларусі» ў сямі тамах. У 1992 годзе М. Ткачоў у сааўтарстве выдаў кнігі «Вялікае мастацтва артылерыі» і «Старажытны Мсціслаў».

Навуковыя працы М. Ткачова вызначаюцца багаццем фактычнага матэрыялу і сапраўднай аб'ектыўнасцю. У іх па-новаму высвеціліся многія старонкі нашай гісторыі. Пад кіраўніцтвам М. Ткачова распачата выданне «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» ў шасці тамах, падрыхтавана да друку аднатомная энцыклапедыя «Археалогія і нумізматыка Беларусі».

Плённую навуковую і педагагічную працу М. Ткачоў спалучаў з актыўнай грамадскай і палітычнай дзейнасцю. Ён быў заснавальнікам і кіраўніком гісторыка-культурнага клуба «Паходня» ў г. Гродна. 19 кастрычніка 1988 года ўвайшоў у аргкамітэт Беларускага народнага фронту. На ўстаноўчым з'ездзе БНФ абраны намеснікам старшыні Сойму. Выступаючы за незалежнасць нашай краіны, адраджэнне гістарычнай памяці народа, за дзяржаўны статус беларускай мовы, М. Ткачоў лічыў, што пераход да дэмакратыі, рыначнай эканомікі павінен адбывацца з улікам інтарэсаў працоўных. Ён быў адным з ініцыятараў адраджэння сацыял-дэмакратычнага руху на Беларусі. У сакавіку 1991 года на ўстаноўчым з'ездзе Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады быў абраны старшынёю Цэнтральнай рады партыі.

М. Ткачоў з'яўляўся членам праўлення Беларускага фонду культуры, членам Рады Беларускага краязнаўчага таварыства, уваходзіў у склад Беларускага камітэта абароны міру.

Як навукоўца, грамадскага і палітычнага дзеяча Міхася Ткачова вызначала глыбокае разуменне своеасаблівасці беларускага гістарычнага лёсу, неабходнасці паяднання ўсіх грамадскіх сіл краіны на грунце палітычнага, сацыяльнага і духоўнага адраджэння Беларусі.

За важкі ўклад у развіццё беларускай культуры М. Ткачоў узнагароджаны медалём Францыска Скарыны.

Міхась Ткачоў быў чалавекам вялікай душэўнай шчодрасці, дабрыні, высокай культуры і інтэлігентнасці. Здольнасці даследчыка, працавітасць, адкрытасць да дыялога дапаўняліся літаратурнай адоранасцю і натхнёнасцю публіцыста. Усё гэта спрыяла самаму высокаму аўтарытэту Міхася Ткачова ў грамадстве.

Светлая памяць пра Міхася Аляксандравіча Ткачова — таленавітага вучонага, сумленнага грамадзяніна, змагара за адраджэнне Бацькаўшчыны і шчырага абаяльнага чалавека — назаўсёды застанецца ў сэрцах удзячных суайчыннікаў.

С. Шушкевіч, В. Кебіч, М. Дзямчук, В. Быкаў, Н. Гілевіч, А. Бутэвіч, Я. Вайтовіч, В. Гайсёнак, П. Казлоўскі, П. Краўчанка, А. Герасіменка, Л. Сушчэня, Р. Гарэцкі, У. Ганчарык, З. Пазьняк, А. Трусаў, А. Дабравольскі, Я. Лугін, М. Ермаловіч, М. Статкевіч, В. Зуёнак, І. Лучанок, Г. Буралкін, А. Дудараў, І. Чыгрынаў, Ф. Капуцкі, М. Касцюк, А. Мальдзіс, М. Гіль, С. Законнікаў, В. Іпатава, У. Наркевіч, І. Сярэдзіч, А. Шабалін, І. Хаўратовіч, С. Самуэль, Я. Малашэвіч, В. Скалабан, М. Курловіч.

У жальбе нашы сэрцы

Вечарам 31-га кастрычніка, на 51-м годзе жыцця, у самым росквіце творчых сіл памёр Міхась Ткачоў. Няўмольны лёс, асабліва суровы да Беларусі, забраў аднаго з лепшых яе сыноў. Сям'я страціла клапатлівага мужа і бацьку, Айчына — таленавітага гісторыка і публіцыста, будзіцеля і асветніка, чалавека, які разам з паплечнікамі пачынаў новае Беларускае Адраджэнне. Наша ж партыя страціла адданейшага працаўніка, свайго Старшыню.

Нарадзіўшыся ў старажытным Мсціславе, Міхась Ткачоў яшчэ ў маленстве ля муроў спракаветных бажніц пазнаёміўся з беларускай мінуўшчынай. Захапленне гісторыяй узмацнела ў студэнцкія гады. Гэта і прадвызначыла далейшы выбар — аспірантура і праца над вывучэннем сярэднявеччыны Беларусі, плённая выкладчыцкая работа. І як вынік — больш за 400 артыкулаў, шматлікія кніжкі, навуковая ступень доктара навук, званне прафесара, усеагульнае прызнанне. З канца 70-х гадоў, не зважаючы на цкаванне служак камуністычнага рэжыму, Міхась Ткачоў самааддана ўключаецца ў адраджэнска-асветніцкі рух, а з канца 80-х ён ужо сярод заснавальнікаў Беларускага народнага фронта. Летам 1990 г. частка народфронтаўцаў — прыхільнікаў ідэалаў сацыяльнай справядлівасці пачынае работу па адраджэнню сацыял-дэмакратычнай партыі. З імі і Міхась Ткачоў. Вопыт арганізатарскай работы, навуковы і палітычны аўтарытэт, разважлівасць і прынцыповасць пазіцыі, чалавечая абыходлівасць паўплывалі на выбранне яго сацыял-дэмакратамі ў сакавіку 1991 г. сваім партыйным лідэрам. За мінулы ад устаноўчага з'езду час Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада заняла прыкметнае месца ў палітычным жыцці краіны, выйшла на міжнародныя сувязі, мацуе свае шэрагі. І ва ўсім гэтым несумненная заслуга старшыні партыі.

Глыбока смуткуем з-за непапраўнай страты. У жальбе нашы сэрцы. Але хай роспач не адбірае нам сілы — уперадзе шмат працы для незалежнай Беларусі. І ў г

БЕЛАГРАПРАМБІРЖА МЕНСК

Звярніце ўвагу!

УПЕРШЫНЮ

акцыянернае таварыства «БЕЛАРУСКАЯ АГРАПРАМЫСЛОВАЯ БІРЖА»

прадастаўляе магчымасць азнаёміцца са скарочаным у 10 разоў пералікам тавараў, прапанаваных на продаж па свабодных цэнах на таргах у пятніцу 30 кастрычніка 1992 года.

НАПАМІНАЕМ, што ў лістападзе гэтага года праводзяцца першыя асеннія адкрытыя таргі, на якіх у Вас з'яўляецца магчымасць бясплатна азнаёміцца з работай самай буйной біржы Рэспублікі Беларусь і з поўным пералікам тавараў, а таксама прадаць ці купіць неабходную Вам прадукцыю.

Даведкі па тэлефонах біржавага канала: 77-01-37, 77-07-26.

Назва віду прадукцыі	Адзінка вымярэння	Колькасць	Цана за адзінку (рублёў)
Акцыя АТ «Белагрупрамбіржа»	15 штук		45000-50000
Жыта харчовае	459 тона		20000-23000
Пшаніца харчовая	60 тона		41000
Ячмень фуражны	10 тона		22000
Жыта насеннае азімае	50 тона		21000
Жыта фуражнае	25 тона		19800
Насенне ячменю «верас»	10 тона		30000
Бульба харчовая	3500 тона		15500-22000
Насенне бульбы, эліта «Лошыцкая»	400 тона		17000
Цыбуля рэпчатая «ШТУТГАРТ»	10 тона		25000
Саджанцы на клонавых прышчэпах (нізкарослыя) яблыні, слівы	40000 штук		70
Насенне елкі	200 кг		35000
Саджанцы трохгадовыя айвы «маулея»	1000 штук		95
Алей рапсавы тэхнічны ГОСТ 8988-77	200 тона		145000
Яд пчаліны, збор 1992 г. у РБ	1200 грам		12000
Насенне люцэрны	1000 кг		60
Корань жэньшэню	100 грам		2000
Купкоўка зборная	100 тона		60000
Аўсяніца трысняговая	100 тона		60000
Аўсяніца лугавая	107 тона		67000-210000
Цімафееўка 1 рэпрадукцыя	205 тона		35000-65000
Насенне райграсу аднагадовага	70 тона		18000
Каласоўнік безасцюковы	6 тона		30000
Мазь «Залатая зорка» вытворчасці В'етнам, упакоўка па 10 шт.	5000 штук		35
Цялушкі племянныя, сярэд. вагі 300 кг	30 тона		80000
Мяса КРС ў жывой вазе	410 тона		50000-80000
Коні на мяса партыя 25 галоў	10 тона		120000
Парасяты вага 25-45 кг, 1000 галоў	1 кг		130
Свініна ў жывой вазе	5 тона		150000
Воўна паўтонкарунная	8 тона		350000
Пража з адноўленай шэрсці ў матках па 200 г рознага колеру, 37 тон	1 маток		30
Карп таварны, 300—500 г	10 тона		55000
Яблыкі працёртыя з цукрам 0,5 л	100000 слоік		25
Сухое бульбяное пюрэ (камякі)	100 тона		150000
Таматы марынаваныя, слоік 3 л	36000 слоік		100-144
Агуркі марынаваныя, слоік 3 л	20000 слоік		126
Кабачкі марынаваныя, слоік 3 л	1000 слоік		188
Тушонка ялавічная ў бляшанцы № 9 338 г, ліцэнзія ў Расію	4500 бляшанка		80
Кампот слівовы, слоік 1 л, ліцэнзія ў Расію	12360 слоік		80
Напітак яблычна-вінаградны, слоік 1 л, ліцэнзія ў Расію	35300 слоік		27
Жэньшэневы напітак (КНДР), бутэлька 0,8 л	3000 бутэлька		120
Шампанскае Крымскае белае	5000 бутэлька		280
Дрожджы кармавыя 46% у мяшках	55 тона		32500
Напітак журавінны, слоік 3 л	2000 слоік		55
Воцат спіртавы, харчовы 9%	35000 бутэлька		42
Шакаладны крэм у банках па 400 г, вытворчасць Германія	1000 банка		300
Соус таматны, 0,5 л	10000 слоік		59
Ялавічына тушаная 0,5 л	5000 бляшанка		100
Казенакі	500 кг		200
Арахісавы арэх	39000 кг		40
Сок таматны, слоік 3 л	4000 слоік		100
Арахіс лушчаны	10000 кг		150
Насенне сланечніку	20000 кг		35
Марожанае пламбір, сметанковае	10000 кг		58-135
Трактар Т-25 (б/у)	1 штук		145000
Трактар МТЗ-82	25 штук		900000
Абсталяванне бульдозера на Т-130	3 штук		40000
Адвал бульдозера на Т-130	3 штук		23000
Мінітрактар з нав. абсталяваннем	1 штук		250000
Прычэп тракт. з нав. абсталяваннем	1 штук		32000
Цялежка ТУ-300	100 штук		2600
Граблі прычапныя ГВЦ-3	90 штук		17000
Бурачная сеялка А-697, вытворчасць Германія	5 штук		100000
Раскідвальнік угнаенняў МВУ-5	5 штук		45000
Раскідвальнік МЖТ-6	2 штук		129000
Агрэгат АІР-20	1 штук		45000
Транспарцёр ТЗК-30	1 штук		15000
Устаноўка камбікормавая УМК-Ф-2	1 штук		250000
Падкормнік штангавы РШУ-12	3 штук		50000
Корнеўборачная машына МКК602	1 штук		240000
Трактарны прычэп 2ПТС-4	12 штук		65000
Прычэп 2ПТС-4 без бартоў	146 штук		34000
Раскідвальнік РЖТ-4Б	200 штук		90000
Плуг конны	100 штук		1200
Культыватары чызельныя	180 штук		38000-82000
Культыватар акучнік КОН-3	30 штук		27000
Агрэгат глебаапрацоўчы АПР-2,6	20 штук		38000
Сушылка для траў і пылку	10 штук		4500
Камплекты для збору пчалінага яду «Крышталь» - 1, 2, 3	15 штук		6000-10500
Бульбасартавальны пункт КСП-15В	1 штук		195000
Бульбасартавальны комплекс КСП-25	2 штук		560000
Сушылка КСПЛ-09 (з мантажом)	3 штук		560000
Кормаздрабняльнік універсальны	114 штук		7600
Мінітрактар МТЗ-12К	1 штук		40500
Здрабняльнік ІРМ-60	2 штук		30000
Сеялка СУПН-8	4 штук		28000
Барабан АВМ-1,5	1 штук		250000
АВМ-065 з газавай фарсункай, новая	1 штук		500000
Транспарцёроўшчык рул. сена, саломы	1 штук		145000
Барана «Зігзаг» БЗСС-1	50 штук		1200
Ланцуг 3-канцовы прывязны	3000 штук		100

Назва віду прадукцыі	Адзінка вымярэння	Колькасць	Цана за адзінку (рублёў)
Капустаўборачны камбайн УКМ-2	2 штук		6840
Буракарэзка прывадн. КПІ-4	10 штук		7240
Церазсядзельнік	200 штук		69
Аброць	30 штук		131
Бульбасаджалка Л202	1 штук		33428
Прэс-падборшчык «Кіргізстан»	1 штук		300000
Прэс-падборшчык ПВ-6	1 штук		100000
Пагрузчык ПТС-77	1 штук		700000
Пагрузчык ПЧ-88 на трактар «Кіравец»	1 штук		2500000
Культыватар КФГ-3,6	2 штук		5000
Раскідвальнік МЖТ-Ф-11	2 штук		82000
Здрабняльнік кармоў ІРМ-50	4 штук		10000
Прыстаўка для ўбор. кукурузы ППК-4	2 штук		12000
Плуг конны КВП-27	8 штук		1000
Плуг 4-корпусны ПЛН 4-35	3 штук		25000
Топка СЗШ	1 штук		10000
Адвалы для трактара ДТ-75	14 штук		144420
Кармушка для свіней	100 штук		850
Барана 30Р 07	400 камплект		13000
Каткі 3 ККШ-6	7 камплект		13000
Жняярка ЖСК-4А	2 штук		63000
Стагакід БФ-0,5	3 штук		150000
Сеялка СУПО-6	1 штук		5100
Здрабняльнік ПДК-Ф-М-10,3	8 штук		30000
Культыватар КВК-4	3 штук		7000
Паўпрычэп тракт. ОЗТП-9555 (1ПТС-9)	5 штук		62000
Раскідвальнік РЖТ-4	1 штук		45000
Пагрузчык ПГ-02	1 штук		45000
Раскідвальнік МЖТ-6	2 штук		80000
Прычэп 2ПТС4 (45 м куб)	4 штук		106000
Раскідвальнік МЖТ-11	2 штук		85000
Раскідвальнік ПРТ-7	5 штук		63000
Комплекс збожжаачышчальны, камплект: К275А, К475, транспарцёр, трыблок	1 штук		900000
Акучнік конны ОРВ	15 штук		1300
Ямакапальнік КЯУ-10	5 штук		5000
Жняярка лафетная ЖРП-4,2	2 штук		75000
Прыстасаванне для ўборкі насення, траў ПСТ-10	10 штук		2500
Сеялка СПТ-7,2	1 штук		20000
Жняярка мадэрн. да камбайна «Ніва» СК-5	2 штук		120000
Бульбасаджалка 2-радная Л-201	5 штук		30000
Пагрузчык на самаход. шасі ПГ-02	3 штук		44000
Комплекс для пратруч. насення КПС-10	2 штук		15000
Мотакультыватар «Крот»	5 штук		19500
Раскідвальнік ПРТ-10	2 штук		100000
Прычэп-ёмістасць ПСЕ-Ф-12.5	1 штук		250000
Касілка КС-2.1	50 штук		40000
Прэс-падборшчык рулонны са шпагатам ПРФ 2,5	10 штук		380000
Інкубатар бытавы на 70 яец	20 штук		5600
Камбайн кормаўборачны КСС-2,6	1 штук		500000
Карбід кальцыю	111 тона		97500-140000
Плёнка поліэтыленавая	1800000 м кв.		9-12
Бензін А-76	500 тона		55000
Спірт этылавы, тэхнічны	70 тыс.літраў		40000
Карбамід	220 тона		14500
Фарба эмаль	10000 кг		60-154
А/пакрышкі 320×508 (МАЗ)	100 штук		18047
А/пакрышкі 260×508 (ЗІЛ)	100 штук		11840
А/пакрышкі ГАЗ-53 240×508	100 штук		9941
Труба п/э д 32мм	2100 паг.метр		45
Труба ПВХР d=110	1000 паг.метр		290
Поліэтылен № 162-04	1000 кг		110
Шпагат поліпрапіленавы сенапрэсавы, ліцэнзія	50 тона		350000
Калійная соль	100 тона		3800
Тарфяны брыкет БТ-6	10000 тона		780
Ізастужка «ПХВ»	4000 кг		350
Аксігумат	20 тона		10000
Хім.валакно НІТРОН, «С» «Віскум», «Урал Т15МА2», «ЛО22», «УПА 6:40»	137 тона		78000-322000
А/шына МІ-16	3600 штук		8000
Полістырол УПН-0503/0508	2 тона		120000
Клей ПВА	10000 кг		140
Лінолеум	1000 м кв.		450
Аўтобус ТАРЗ-3207	1 штук		850000
ЗІЛ 431410	10 штук		700000
ЗІЛ 433360	10 штук		750000
ЗІЛ В433318	10 штук		1650000
Наборы эл. абсталявання для ГАЗ-24, ЗІЛ-130, ГАЗ-66, ГАЗ-53-12	200 штук		3680-6870
А/прычэп ГКБ-8328, г/п 6 тон	1 штук		70000
Аўтакран КС 3575А на базе ЗІЛ 133 (г/п 10т, страла 15.3м)	1 штук		4000000
Аўтакран КС 3575А на шасі КрАЗ	1 штук		3900000
Пагрузчык да ГАЗ-51 г/п 5 т	1 штук		600000
Экскаватар ОЭ-2621	1 штук		1300000
Кран на базе ЗІЛ-130	1 штук		1600000
Пласкарэз глыбакапальнік ПГЗ,5	1 штук		22000
Аўтакран на базе ЗІЛ-130, г/п 6,3 т	1 штук		1500000
Скрэпер-трэйдэр, Т-150, скрэпер МОАЗ	1 штук		450000
Рысоры пяроднія, заднія	2000 штук		2650-4150
Пасажырскі транспартны сродак «Валгар» на базе ГАЗ-53	1 штук		670000
Аўтамабіль УРАЛ-375, канверсійны	14 штук		170000
Аўтамабіль КамАЗ, цэментавоз	1 штук		1500000
Скрэпер МОАЗ 6014	1 штук		750000
Стартэры №№ СТ-230К, 402, 402А, 402Б, 230Е, 230К, 230А, 230БЗ, 142Б	1600 штук		4500-13500
Электрапагрузчык ЕВ687, г/п 1.5 т	1 штук		900000
Трактар Т-330	1 штук		2400000
Пагрузчык ПГ-0,2А на Т-25, Т-16	1 штук		30000
А/м МАЗ-79091, 79092, 7313, 543А, 543М, 543, 73132, 7429, 73136, ліцэнзія	9 штук		4972390—5791250
Паўпрычэпы МАЗ-9988, 99882, 938	3 штук		530000—1488100

Назва віду прадукцыі	Адзінка вымярэння	Колькасць	Цана за адзінку (рублёў)
Прычэпы МАЗ-8385, 83851, ліцэнзія	2 штук		1196400—1200900
Скрэпер МОАЗ 6014	1 штук		800000
Пагрузчык дызельны UNC-060 Чэха-Славакія, N=85 к.с.	1 штук		1500000
Аўтафургон для перавозкі людзей (пад шасі ГАЗ-53)	50 штук		130000
А/м Урал 375 Д, рух. ЯМЗ-236	1 штук		450000
БЕЛАЗ 74305, 30-тонны	1 штук		10000000
А/м МАЗ-54329	1 штук		6200000
Рухавік да МАЗ тып ЯМЗ-238	10 штук		520000
Паддон скрынчны СП-5-0, 60-2	1000 штук		2000
Цвікі 2×40, 2.5×50, 2.5×60, 3×70, 3×80, 4×100, 4×120, 4×150	500 тона		28000-33000
Папера ламін. для ўпакоўкі малака	15 тона		43000
Цэгла сіл. палутарная	200000 штук		4
Цэмент-партланд М-400	2000 тона		2100
Папера афсетная	100 тона		33500-43500
Кардон тэхнічны	60 тона		28500
Папера кніж-часоп. афсетная	100 тона		28000-31500
Кардон хромэрзац	45 тона		40500
Кардон пюрпак	45 тона		42500
Кардон тэтрапак	45 тона		41500
Кардон тэтрабрык	45 тона		42000
ДСП шліфаваная таўшч. 16 мм	66 м куб.		7300
Фанера хв. пор т. 9,5 мм, бяроза-10мм	66 м куб.		17100
Фанера лам. хвойная, бярозавая	166 м куб.		23760-24100
Пліта 2ПГЧАТ5, р-р 6×1.5 м	100 штук		2600
Пліта ПК 60.12-АТ5	112 штук		3100
Дошка неабрэз. ліст.парод, таўшчыня 25-40 мм, даўжыня 6 м	100 м куб.		2950
Азбеста-цэментныя трубы водаправ. d=150 мм, даўжыня 4 м	1750 паг.м		205
Пліта дэк. аддзел. (пад мармур)	100 м.кв		400
Планка тарн. таўшч. 16мм, шыр. 16-40 мм	100 м.куб		3800
Азбеста-цэментныя трубы, дыам. 400 і 500 мм, даўж. 5 м, з муфтамі	200 штук		1000
Папера друкарская	150 тона		27500-30500
ДСП 1.83×2.75, таўшчыня 16 мм	100 м куб.		6800
Фанера радавая	50 м куб.		18300
Пліта цеплаізаляц. (палістырол)	100 м куб.		6100
Блокі шлакабетонныя	100 м куб.		1200
Плітка тратуарная, таўшч. 6 см	38000 штук		15-24
Плітка аблiцовачная неглазур.	400 м кв.		157
2-павярховы 2-кватэрны дом КПД	3 камплект		1000000
Керамзітабетонныя блокі аблегчаныя (па французз. тэхналогіі)	500 м куб.		1600
Пяскабетонныя блокі аблегчаныя (па французз. тэхналогіі)	500 м куб.		1500
Блокі фундаментныя ФБС 24×4×6	650 штук		1000-1164
Блокі фундаментныя ФБС 24×3×6	1250 штук		870-1000
Блокі фундаментныя ФБС 24×5×6	1200 штук		1455
Блокі фундаментныя ФБС 24×6×6	600 штук		1852
Дзвярныя блокі	110 штук		1600-1800
Дошка неабрэз. хв. парод, даўжыня 4 м, таўшч. 25 мм	200 м куб.		4000
Плітка фасадная «кабанчык»	274 м кв.		60
Міжпанельны ўшчыльняльнік «Герлат»	7000 кг		7
Труба канал. керамічная D=350	300 паг. м		12
Лес яловачнік, бяроза, d=3—5 см, даўжыня 3—6 метраў	800 м куб.		2000
Сетка-рабіца 1.5×10 м	10000 м кв.		120
Камплект ж/б кан. 2-пав. 2-кв. ж. дом КПД 3,4 к. б/пад.	15 камплект		585000
Керамзітабетон	14000 м куб.		3600-3800
Вапна негашаная	4000 тона		50
Гараж разборны металічны	1 штук		55000
Чарапіца гліняная чырвоная	5500 штук		20
Дэкаратыўны пластык	12000 м кв.		260-280
Шкло ліставое аконнае	37000 м кв.		133-210
Шкло пракатнае для цяпліц	8400 м кв.		137
Шкло ўзорыстае ліставое	9600 м кв.		163
Пліты перакрыццяў СПР 60×600 р-р 1,5×6 м	500 штук		7000
Пліты плота р-р 4×6 м	500 штук		6000
Шпон (дуб, бук)	20000 м куб.		56
Труба поліэтыленавая	569 штук		1150-23850
Трубы таўстасценныя ШХ	10 тона		35000
Агрэгат ацяпляльны АО-6.3, АО-2	10 штук		5000
Помпавы агрэгат АН-2К-9	5 штук		10000
Зварачны агрэгат VOLTMEISTER 250	6 штук		40000-47000
Станок дрэваапрац. 4-х бакоў С25-4А	1 штук		1500000
Станок дрэваапрац. мнагапільны Ц4Р26 «САМ»	1 штук		600000
Лінія выпечкі хлеба (імпартная)	1 штук		1000000
Электрарухавікі	435 штук		550-34000
Трансфарматар зварачны ТС-200	230 штук		8500
Станок дрэваапрацоўчы 93.52.00.000	10 штук		25000
Трансфарматары Т-0,66 50/5	150 штук		850
Трансфарматары Т-0,66 10/5	87 штук		550
Таль электрычная (ТЭ050)	10 штук		73000
Кінаўстаноўка «Украіна-7»	2 штук		11000
Пісталет для забівання цвікоў ПП-4402	8 штук		1170
Трансфарматар зварачны бытавы	10 штук		15000
Дрэваапрацоўчая лінія (цэх) 13 станк.	1 штук		1550000
Аўтамат па вытворчасці цвікоў	1 штук		980000
Аўт.пераналаджаемая лінія па вытворчасці сталярных вырабаў	1 штук		2500000
Станок свідравальны ОС-15	15 штук		32000
Рэдуктар ТО-25	30 штук		10000
Ціскі станочныя	100 штук		1200
Станок дрэваапрац. ТАІС-042231001	1 штук		27000
Устаноўка «Арыёл-600»	44 штук		10200
Тэрмакамера для ўцяпл. вулляў	21 штук		560
Аналізатар натур. малака АНШ-1М	24 штук		6000

Назва віду прадукцыі	Адзінка вымярэння	Колькасць	Цана за адзінку (рублёў)
Прыстасаванне электрападгону жывёлы ЭПУ-4	18 штук		5800
Станок дрэваапрацоўчы СВПГ-2а	1 штук		260000
Устаноўка для вытворч. сцен. блокаў	3 штук		33000
Станок дрэваапрац. шматаперац.	50 штук		41000
Устаноўка халадзільная ТХУ-14ФО	2 штук		40000
Станок для рэзкі дроту ОКС-4102	1 штук		10000
Электралічыльнік двухфазны	40 штук		2314
Чан шпарыльны для свіней	1 штук		200000
Радыятар РСС-2-2, стальны	800 штук		1700
Кацёл (цеплагенератар) «Утульнасць»	1 штук		100000
Шафа халадзільная ШХ-0,56	20 штук		34000
Машына здрабнення мяса МІМ-300	8 штук		16000
Машына ачысткі караняпл. МОК-350	10 штук		18000
Машына ачысткі цыбулі МОЛ-100	10 штук		14000
Машына рэзкі агародніны МРО-350	10 штук		11000
Машына праціўчная МП-800	10 штук		20000
Бетоназмяшальнік СБ-16Б, 500л	7 штук		155000
Зварачны п/аўтамат УДЗ-1-1 220В	1 штук		25200
Выпрамляльнік зварачны ВД-306 300А	5 штук		48000
Зварачн. трансфарматар ТДМ-317 315А	3 штук		16300
Эл. пліта 3-камф. з духоўкай «Томь»	15 штук		20000
Пасудамыечная машына МПУ-700	5 штук		50000
Станок дрэваапрац. м. НО2500	10 штук		41000
Піларама Р-63-5Б	4 штук		970000
Краты мет. напольн. для жыв. ферм	2300 штук		1200
Аўт. вэнджальная ўстаноўка АКУ-002 300 кг	1 штук		120000
Абсталяванне вэнджальнага цэха 1000 кг/цыкл	2 штук		420000
Вэнджальная шафа 200 кг/цыкл	2 штук		210000
Устаноўка стаматалагічная УС-02-1	1 штук		200000
Станок дрэваапрац. СДБ-2 (220В)	5 штук		34000
Станок дрэваапрац. СДП-1 (380В)	5 штук		34000
Э/агрэгат бензін. АБ-1-0230,1 квт	1 штук		100000
Трансфарматары ОСМ1-0.063 УЗ; ОСМ1-1,6-УЗ; ОСМ1-2,5 УЗ; ОСУ-0,4; ОСМ1-0,63 УЗ; ОСМ1-0,4 УЗ; ОСМ1-0,25 УЗ; ОСМ1-0,16 УЗ; ОСМ1-0,1 УЗ; ОСМ1-1,0 УЗ	7000 штук		822-14956
Вентылятар 8-06-29011 рух. 15 квт	3 штук		30000
ВАЗ 21053 эксп. варыянт	9 штук		1750000
ВАЗ 21073 эксп. варыянт	2 штук		2050000
Падкрылак ВАЗ 2106	20 штук		1000
Крылы для «Масквіч-408»	16 штук		2700
Мікрааўтобус РАФ 2203-01	5 штук		1850000
Накрыўка размеркавальная для рух. ВАЗ-2101, 02, 03, 06	5000 штук		140
Цыліндр колавы зад. тормаза для ВАЗ2101-07	100 штук		300
ГАЗ-2410, 1983 г. выпуску	1 штук		600000
Крылы для ВАЗ-2101,02,11	100 штук		1400
Аўтапакрывала 4×5	400 штук		680
Аўтапакрывала 3×4	400 штук		490
Шпаклёўка аўтамабіля Kalomiks, вытворчасць Югаславія	19200 банка		1570
Рухавік да а/м Масквіч М-408	2 штук		50000
А/м ВАЗ 2121 «Ніва» 1980 г.	1 штук		350000
Стартэры № 424 (ВАЗ 2108—2109); 230Б4 (Волга, РАФ); 421 (Масквіч); 423 (Жыгулі); 42 (Масквіч)	500 штук		5500-6000
Багажнік для легкавых а/м	100 штук		2500
Шпагат ільняны с/г (для руланіравання льносыравіны, сена)	10 тона		150000
Шпагат ільняны адніткавы	3 тона		140000
Пятля раяльная 825 мм	9500 штук		23
Шпагат ільняны для рул. прэсаў	4000 кг		200—250
Кабель ТГ-500×2×0.64, ТГ-500×2×0.54, ТГ-300×2×0.64	3000 м		920-1100
Электроды АНО-6,АНО-18,АНО-4	200 тона		70000
Трубы стальныя	70 тона		27000
Ліст х/к ад 0,8 да 2,0 мм	70 тона		28000
Ліст г/к ад 2 да 24 мм	70 тона		23000
Трубы газаводправодныя ГОСТ-3262-75, д=15 мм, 20 мм, 25 мм, 32 мм, 40 мм, 65 мм, 80 мм, 100 мм	1000 тона		39000-41000
Трубы электразварныя ГОСТ 10704-76, д=60 мм, 76 мм, 89 мм, 102 мм, 114 мм	300 тона		39000
Трубы нафтаправодныя ГОСТ 8732-7868731-78, д=127 мм, 140 мм, 159 мм, 168 мм, 273 мм, 219 мм	300 тона		33000-38000
Арматура д=10	60 тона		24000
Сетка-рабіца, яч. 40×40	340 м кв.		70
Вугалок 50	70 тона		24500
Швелер 6,5	100 тона		22000-23500
Сталь арм. 35ГС А-111, д=10, 12, 14	70 тона		23500
Вугалок 45	30 тона		25000
Вугалок 35	30 тона		26000
Арматура 35ГС АЗ, дыям. 10	30 тона		27000
Дахавая сталь неацынкаваная	15 тона		25000
Труба водаправодная чыгунная раструбная, дыям. 65	7 тона		18000
Круг металічны дыям. 36	40 тона		16000
Бэлька № 55	30 тона		21500
Труба стальная D-51 мм	40 тона		40000
Цыстэрна ЦТА-10 для аміяку	1 штук		40000
Метал. каркас арачнага будынка 14,8×45×7,5 з шыфер. дахам	5 штук		450000
Магазін перасоўны на базе паўпрычэпа	3 штук		190000
Аўтаномная рамонтная майстэрня	1 штук		180000
Стаматалагічная ўстаноўка «Янтар»	1 штук		70000
Сейф ІШМН-1, засыпны	472 штук		5000
Бочка металічная, стальная	2000 штук		2000
Ангар металічны ўцеплены 30×9×6	1 штук		745000
Кольцы калодзежаў ж/б ф 1 м	100 штук		751
Кольцы калодзежаў ж/б ф 1,5 м	200 штук		1182
Цыгарэты «ВТ», пав. партыі	480000 пачак		0.14 US$
Цыгарэты «Пірын», пав. партыі	480000 пачак		0.14 US$

Раіць доктар Мітлайдэр

(Працяг, пачатак у нумары за 28 кастрычніка г. г.).

Месца для агарода. Як адзначалася, глеба, на якой збіраемся вырошчваць ураджай, істотнага значэння не мае. Выключэнне складаюць вельмі цяжкія —балотныя ды гліністыя. Верхні слой на іх заплывае, часта блізка да паверхні падступае вада. Такія ўмовы для раслін яўна цяжкія, і вынік будзе не лепшым. Значыць, глебу трэба спачатку акультурыць. Палепшыць неабходна і камяністыя ўчасткі. Добрыя глебы пясчаныя, супясчаныя, сугліністыя. Але найлепшых вынікаў можна дасягнуць на акультураных агародах. Галоўнае: любы ўчастак павінен да васьмі гадзін (болей—лепей) асвятляцца прамымі сонечнымі промнямі. Цені, паўцені, паўночныя схілы, западзіны — не нашы саюзнікі. Як ні даглядай такія градкі—поспеху не дасягнеш. У цяні расліны выцягваюцца, імкнучыся «пагаварыць» з сонцам. У вырашчанай прадукцыі заўсёды будуць нітраты.

Перш-наперш участак трэба выраўняць. Ён павінен быць, як адзначалася ў папярэдняй публікацыі, роўным, без ухілаў, ямін. Для гэтага выкарыстоўваюцца дошка і спецыяльны прыбор, якім вымяраюць гарызантальнасць будаўнікі,—узровень. Калі ў вас горка, яе афармляюць у выглядзе тэрасаў.

Ідэальны накірунак градаў традыцыйны — з поўначы на поўдзень. Выкарыстоўваючы паўднёвы схіл, заўжды будзеце з высокім ураджаем. Каб пераканацца ў эфектыўнасці метаду Мітлайдэра, неабавязкова ўвесь участак падагнаць, як кажуць, пад адзін капыл. Амерыканскі даследчык раіць пачаць з маленькага — соткі ці нават трэцяй яе часткі. Але зрабіць усё вельмі старанна.



Безумоўна, не абыдзецеся без традыцыйнага абследавання поля на наяўнасць элементаў сілкавання, кіслотнасці. Толькі ведаючы, што ёсць у глебе і ў якой колькасці, можна распачынаць справу.

Даводзячы да ладу пляцоўку, выдаліце ўсё пустазелле. Асабліва шматгадовае: пырнік, конскае шчаўе, асот, дзьмухаўцы, крапіву, хрэн і іншыя. Выдаляйце разам з карэнямі, бо, пакінутыя ў глебе, яны хутка пойдуць у рост. А пры наяўнасці пустазелля ваша старанне не дасць выніку, бо культурныя расліны не забяруць пажыўных рэчываў. Таму акрамя перакопкі і выбаркі непатрэбнага з-пад рыдлёўкі, мэтазгодна яшчэ растрэсці глебу вілами. Кожны карэньчык (нават маленькі) неабходна выбраць і спаліць.

Да непажаданых, скажам так, «кватарантаў» трэба аднесці і вадзяных пацукоў, кратоў, мядзведак. Калі яны завяліся, то не аб'яўляюць ім вайну на саміх градках. Лепш «ваенныя дзеянні» перанесці на міждракоўі. Тут ладкуюць пасткі, закладваць розныя адпуджваючыя рэчывы і атрутныя прынады.

Градкі па Мітлайдэру—гэта нешта зусім незвычайнае ў нашым уяўленні. Яны зусім вузенькія — 45 сантыметраў. Барозны амаль утрая шырэйшыя —105 сантыметраў. Навошта такія «фокусы»? А для таго, каб кожная раслінка атрымала аднолькавыя ўмовы развіцця: сілкаванне і святло. Толькі на вузкіх градках можна дасягнуць зададзенага (строга па нормах!) унясення мінеральных угнаенняў — асновы асноў. (На малюнку злева — вертыкальны разрэз градкі).

Шырокія «барозны» даюць магчымасць гадаваць расліны без падвязак. Можна поле паміж барознамі зменшыць, скажам, на трэць. Але тады трэба будзе мацаваць гадаванцаў да нейкай апоры.

Заўжды грады рабілі высокімі, паміж імі капалі барозны. Па Мітлайдэру гэтага рабіць нельга. Шырокія праходы і вузкія грады—на адным узроўні. Толькі 45-сантыметровыя грады абмежаваны валам з зямлі ў 10—18 сантыметраў. Гэты вал нясе дзве функцыі: засцерагае ад сцёку вады пры палівах і дазваляе эфектыўна змагацца з пустазеллем. Калі толькі-толькі з'явіліся шкодныя расліны (фаза семядолі), валікі злёгку разакучваюцца. Робім гэта ў сонечнае надвор'е. Карэньчыкі вываварочваюцца на паверхню і пустазелле гіне. Пасля гэтага аднаўляем валікі.

Пустазелле ў праходах падразаем спецыяльнымі палольнікамі (можна рыдлёўкай). Знімаем шкоднікаў крышачку ніжэй раставых пупышак. Новых парасткаў яны ўжо не даюць. На гэта звяртаем асаблівую ўвагу, бо ў зямлі заўжды шмат «смецця». Калі зробім глыбокія падрэзы-рыхленні, новыя шпарка пойдуць у рост.

Барозны ніколі не перакопваюцца. Яны застаюцца некранутымі дзесяцігоддзямі. Капаем толькі самі градкі. Гэта, вядома ж, зводзіць да мінімуму цяжкую працу «аратага». Сама копка робіцца адзін раз у год —непасрэдна перад сяўбой ці высадкай расады. Звярніце ўвагу — перад самой сяўбой. Не за тыдзень-два, як мы робім. Такі «аграпрыём» мае адну мэту: не даць пустазеллю (яно заўжды ў глебе!) набыць перавагу перад культурнымі раслінамі. Бо як бывае: морква, скажам, яшчэ і не дала карэньчыка, а паразіт выкінуў зялёны парастак.